ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок комп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА, 11 чэрвеня 1930 г.
№ 135 (3733)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

XIII зьезд КП(б)Б

Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Прамова тав. Хлеўнікава

Раённыя і акруговыя канфэрэнцыі нашай партыі ясна пацьвердзілі нам узрастаючай актыўнасьці, аб вялікім творчым уздыме рабочае клясы, аб зрастаючай палітычнай сьвядомасьці рабочае клясы.

На працягу ўсяго нашага зьезду мы аксама бачылі дэманстрацыі з боку рабочае клясы, дэманстрацыі адданасьці партыі, адданасьці справе сацыялістычнага будаўніцтва. Прывітаньні гомельскіх рабочых, тыя прывітаньні, якія былі тут раней — гэта, таварышы, не рафарэтныя прывітаньні, гэта прывітаньні, якія прасякнуты шчырасьцю, гэта ня пустыя словы ў абяцаньні выканаць пяцігодку за чатыры гады. Тут адчуваецца цьвёрдая воля рабочай клясы.

Гэта выразна пацьвярджае тое, што рабочая кляса ідзе за партыяй на пераготу труднасьцяй, на выкананьне пляну вялікіх работ.

Разам з тым трэба адзначыць рад перашкод у выкананьні прамфінпляну з нашых прадпрыемствах, якія вырашаюцца ў дзённай рабоце «трыкутніка», тым, што прамфінплян не даводзіцца да асобнага цэху, варштату і рабочага, што рабочыя мала ведаюць аб плянах сацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, што рэдка праводзіцца адзінаначальле і д.

Гаворачы аб кепскай рабоце «трыкутніка», мы, зразумела, павінны зьвярнуць увагу і на тое, што работа ВСНГ, лічачы такія напружаныя абставіны па выкананьні прамфінпляну, навіна быць набудавана так, каб тэмпы работы ВСНГ адпавядалі тым запатрабаваньням, якія прад'яўляюць прадпрыемствы, у прыватнасьці па набудове новых прадпрыемстваў.

Будуецца гута. Вялікае прадпрыемства. Набудова пачалася без чарцяжоў, чарцяжы ягчэ ў Маскве ў праектным бюро. Гэта ненармальна. Мяркуецца будаўніцтва ў бліжэйшыя часы вялікай цёпнай электрастанцыі. Таксама цягнецца валынка з праектаваньнем. Сілаты ўстаноўка на Добрупы адцягваецца. Таварышы, калі будуецца новае прадпрыемства або пашыраецца старое, то павінны прадугледзець усе необходныя бытавыя патрэбы рабочае клясы: жоны, сталоўкі і г. д.

Далей, таварышы, я хацеў-бы зьвярнуць увагу зьезду на нашу работу ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі вёскай гаспадаркі. Зараз, як ніколі, абмяркоўваецца пытаньне аб тым, каб гаспадарча ўпарадкаваць калгасы, каб на працягу кароткага часу скончыць зямлеўпарадкаваньне. Вялікая работа партарганізацыі павінна быць накіравана на тое, каб ліквідаваць тыя ненармальныя адносіны, якія ў паасобных мясцох існуюць паміж калгаснікамі і індывідуальнікамі. Гэтыя ненармальныя адносіны ва многіх выпадках існуюць у выніку недарэчнасьці ў справе землеўпарадкаваньня. Напрыклад, мы даўно павінны былі ко працаваць на адводах сельскай калгасам і паасобным дывідуальным бяднякам і серадняцкім сялянскім гаспадаркам. Аднак, відавочна. Наркамзем ня ўлічыў мінулых памылак у гэтай справе, ня ўлічыў таго, то з прычыны ненармальнага зямлеўпарадкаваньня, мы маем шмат недарэчнасьцяй у калгасным будаўніцтве. Зараз на ўдзённых акругах Беларусі праз 14-15 дзён пачнецца ўборка сенажаці, а пастанова аб парадку адводу сенажацяй калгасам і індывідуальнікам надрукавана два дні таму назад, а кожная акруга ня мае магчымасьці па-свойму выдумляць, выносіць сваю пастанову без агульных дырэктыў урадавых органаў.

Таварышы, некаторыя дэлегаты Гомельскай арганізацыі выступалі ў сувязі з перадавіцай у газэце «Зьвязда», якая была надрукавана ў часе ходу акруговай партыйнай канфэрэнцыі Гомельскай акругі. Я павінен таксама завастрыць увагу зьезду на гэтым пытаньні. Мы ўсе ведаем, якую вялізарную ролю адыграла «Зьвязда» — цэнтральны орган нашай партыі ў барацьбе з правым апартунізмам, у барацьбе за генэральную лінію нашай партыі. «Зьвязда» бязьлітасна змагалася з нацыянал-дэмакратамі, якія імкнуліся ўнесьці свае апартуністычныя карэктывы ў правільную ленінскую палітыку нашай партыі. У гэтым заслугі «Зьвязды», бязумоўна, ёсьць.

Лічу, аднак, што памылкай было адно месца ў перадавой, якая была надрукавана ў «Зьвязьдзе» ад 19 мая, дзе гаварылася аб Гомельскай партканфэрэнцыі. Мы чытаем наступнае:

«Мы маем факты адкрытых вылазак, атакі супроць ЦК і яго правільнай палітычнай лініі, якую ён ажыцьцяўляў у калгасным будаўніцтве. Такія выступленьні мы мелі на адбываючайся 4-й акруговай Гомельскай партканфэрэнцыі ў прамовах некаторых таварышоў»..».

Гомельская партканфэрэнцыя праходзіла пад сьцягам бальшавіцкай самакрытыкі. Ніводзін з выступаючых прамоўдаў ні ў якім разе ня ўзавальваў памылкі на ЦК, не шальмаваў кіраўніцтва ЦК.

Калі ставіцца пытаньне аб барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, дык цэнтральны орган нашай партыі — газэта «Зьвязда» павінна змагацца з ухіламі так, каб па гэтым вывучань партыйную арганізацыю. Газэта «Зьвязда» павінна змагацца з усякімі праявамі правага апартунізму, «левых» загібаў, бяз крыклівасьці, бяз шумлівасьці, калі біць на апартуністым, дык па сапраўдным апартуністым, каб ня даць міма цэлі. А то знайшлі апартуністага Кухаркіна — рабочага, які самаахвярна адданы партыі, які нікуды ня ўхіляецца ад генэральнай лініі партыі. Скажэце, калі ласка, калі Кухаркін сказаў, што ЦК КП(б)Б спазьніўся в прызнаньнем сваіх памылак, то тут вы знайшлі апартунізм. Калі Кухаркін сказаў, што мы мала зварачаем увагі на індывідуальны сэктар сельскай гаспадаркі — тут апартунізм. Што вы тут крамольнага знайшлі ў прамове тав. Кухаркіна? Пасьля яго выступала ягчэ чалавек 8-9. Такім чынам, уражаньне аб'ектыўна стварацца, што газэта «Зьвязда» — граміць Гомельскую акруговую арганізацыю ў асобе яе канфэрэнцыі. Там напісана «Кухаркін і г. д.», а пад «і г. д.» можна разумець вельмі шырокае кола людзей.

Я не магу абыйсьці маўчаньнем таго, аб чым тут многія гаварылі. Пачну з выступленьня т. Араніштама. Ня гледзячы на тое, што Араніштама абаранялі, салідарызаваліся з яго выступленьнем рад таварышоў і вайсковых, і прадстаўнікоў паасобных дэлегацый, я ўсё-ж лічу, што выступленьне Араніштама — няправільнае выступленьне.

Прамова тав. Адамовіча

Таварышы! КП(б)Б мае вялікія дасягненьні, посьпехі ў сэнсе эканамічнага культурнага разьвіцьця БССР. Тыя паказьнікі, якія мы чулі ў дакладзе Гея—рост народнай гаспадаркі і рост прамысловасьці, набудова новых фабрык заводаў і рост сацыялістычнага сэктара на вёсцы, рост фінансаваньня капітальнага будаўніцтва—гаворыць аб вялікай рабоце, праробленай нашым ЦК.

Той энтузіязм рабочай клясы за выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі ў чатыры гады і за выкананьне прамфінпляну таксама гаворыць аб правільным кіраўніцтве ЦК КП(б)Б, гаворыць аб правільнай палітычнай лініі Цэнтральнага Камітэту.

Я хачу спыніцца на выступленьні некаторых дэлегатаў, якія я магу кваліфікаваць, як пасюк на партыйнае кіраўніцтва. Гэта выяўляецца ў тым, што тыя таварышы пералічылі некаторых членаў бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, пачынаючы ад другога сакратара і канчаючы астатнімі членамі, і гаварылі аб тым, што яны неправільныя далі ўстаноўкі.

А раз так выходзіць, што неправільнае было кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэту і ў той-жа час яны, гаворачы аб неправільнай устаноўцы, гаворыць, што ня Цэнтральнага Камітэту была правільнай.

Тав. Чарвякоў ня раз прызнаваў і гора таксама прызнаў свае памылкі, але ўсё такі мы павінны сказаць, што яго досыць памыляцца. Тав. Чарвякоў ціпен павесьці рашучую барацьбу з правым апартунізмам і нацыянал-дэмакратызмам, барацьбу за генэральную лінію партыі.

Ніхто тут не гаварыў аб становішчы саўгасаў. Праўда, т. Гей падкрэсьліў, што нашы саўгасы ягчэ не заўсёды яўляюцца паказальнікам на вёсцы таму, як вёсьці сельскую гаспадарку бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Патрэбна умацненьне працы саўгасаў у сэнсе забясьпячэньня кадрамі, у сэнсе ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва ў гэтых саўгасах. Цэлы рад ячэек не стаяць на чале кіраўніцтва, а цягнуцца ў хвасьце, таксама і партыйны асяродак, г. зн. партыйнае кіраўніцтва ў саўгасах вельмі слабае. Трэба будзе пова-абранаму ЦК і Бюро зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку сакратароў саўгаскіх і калгаскіх ячэек.

Накопт працы сярод батрацтва. Цяпер, як быццам, справа паляпшаецца ў працы сярод батрацтва таму, што значная частка батракоў пашла ў калгасы, але ўсё-ж такі значная частка засталася і працуе ў кулакоў. Праца сярод батрацтва значна пагоршылася ў сувязі з тым, што ліквідаваны акруговыя аддзелы саюзу СГЛрабочых.

Накопт ліквідацыі кулацтва, як клясы, па глебе суцэльнай калектывізацыі. У гэтым напрамку прароблена значная работа нашай арганізацыяй і тут былі даны выразныя дырэктывы з боку Цэнтральнага Камітэту. Але ў практычнай працы па ажыцьцяўленьні гэтых дырэктыў мы мелі цэлы рад перагібаў з боку некаторых работнікаў.

Аб куставых аб'яднаньнях. Хаця гэтае пытаньне патрэбна было-б паставіць на дакладу аб калектывізацыі, але я хачу сказаць на дакладу ЦК, што куставыя аб'яднаньні сябе не апраўдалі і таму трэба будзе паставіць пытаньне накопт ліквідацыі іх і ўзмацніць райпаляводсаюзы, забясьпечыўшы іх належнымі інструктарамі для таго, каб быў адзіны цэнтр, які будзе кіраваць калгасамі.

Я хачу ягчэ сказаць адносна прыёму вясковай інтэлігенцыі ў партыю. У нас ёсьць актыўныя настаўнікі, дактары, фэльчары, якія жывуць у вёсцы і якія карысны для партыі, але ня могуць быць прыняты ў партыю, бо ў іх няма гэтых паручэльляў з вытворчасьці і іх яны ня могуць дастаць. Я лічу што, XIII зьезд павінен гэта пытаньне абгаварыць.

Прамова тав. Эльмана

Я хацеў спыніцца на працы нашых вясковых ячэек. 1-е пытаньне — гэта праца з беднатой і батрацтвам. Мы маем базумоўна некаторыя посьпехі ў гэтай справе як колькасныя, так і якасныя, але мы адначасова з гэтым павінны прызнаць, што ў нас групы бедноты не працуюць так, як гэта патрэбна. Групы беднаты працуюць кампанейска і ад выпадку да выпадку. У сувязі з гэтым мы маем і слабасьць росту партыі за лік калгаснікаў, батракоў і беднаты. Я гэтым не хачу сказаць, што мы не расьцем за лік лепшых прадстаўнікоў групы беднаты, але гэта работа не настаўлена сыстэматычна.

Нашы ячэйкі ягчэ ня ведаюць, якія працэсы адбываюцца ў калгасе, у які час расьце калгас, што ў калгасе здараецца і якія ў калгасе балячкі. Нашы вясковыя ячэйкі павінны адыгрываць кіруючую ролю ў калгасным руху, а мы гэтага на сёньняшні дзень ягчэ ня маем.

Аб партвучобе. Трэба сказаць, што мы партвучобу ў гэтым годзе зусім правалілі і мы, таварышы, павінны ў падыходзячы зімовы перыяд партвучобу паставіць так, каб можна было кожнаму вясковаму партыйцу прайсьці як сьлед гэту вучобу.

Накопт кадраў. Мы паслалі 25 тысяч лепшых пралетараў у калгасы, мы паслалі рабочых з гораду ў сельсаветы, і гэта добра, але-ж мы ягчэ не заняліся пытаньнем, каб паслаць лепшыя кадры з гораду для ўзмацненьня нашых партыйных вясковых ячэек.

Апошняе пытаньне — гэта аб тым, каб не пасылаць таго ці іншага работніка, які сябе чым-небудзь скампрамэтаваў, па вышэйшую працу, як гэта мела месца з т. Лацысам з Віцебску.

Прамова тав. Крохмаля

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, за перыяд з XII да XIII зьезду мае вялізарныя посьпехі ў сваёй рабоце ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва прамысловасьці, у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Ня гледзячы на ўсе тыя недахопы, памылкі і перагібы, якія мы мелі ў справе калектывізацыі, наша партыя на гэтым участку сваёй работы мае вялікія посьпехі.

Я лічу вялізарным посьпехам нашай партыйнай арганізацыі і дасягненьнем у рабоце ЦК тое, што на даным зьезьдзе мы мелі выступленьне тав. Чарвякова, які голасна заявіў аб сваіх памылках, які асьвядоміў свае памылкі і стаў на правільны шлях, на шлях выпраўленьня сваіх памылак у практычнай рабоце. Вялікае дасягненьне і тое, што нашы партыйныя арганізацыі дабіліся, што кожны член партыі добра ўразумеў усю шкодласьць і сутнасьць праваапартуністычнай практыкі, найбольш выразным выяўленьнем якое была прыпчэпаўшчына. Вялікім дасягненьнем выяўляецца і перамога тых нацыянал-дэмакратычных, нацыянал - апартуністычных праяў, якія мелі месца ў нашай партарганізацыі да, і часткова, пасьля XII зьезду КП(б)Б.

Усе гэтыя дасягненьні неабходна на зьезьдзе падкрэсьліць, іх ня трэба памяншаць. Пытаньне аб кадрах — адно з важнейшых пытаньняў сёньняшняга дня. Таму на вырашэньне гэтага пытаньня трэба накіраваць максымум увагі як партыйнага зьезду, так і ўсёй арганізацыі. Калі мы зірнем на перагібы і памылкі, якія мелі месца ў рабоце па калектывізацыі, то мы ўбачым, што яны ў значнай ступені залежалі ад невыстарчальнай пісьменнасьці і падрыхтоўкі нашых аспоўных як партыйных, так і савецкіх кадраў.

Зараз аб пытаньнях далейшага калгаснага будаўніцтва. Чым хутчэй і лепш мы замацуем нашы калгасы, чым хутчэй паставім у іх работу і гаспадарча замацуем, тым хутчэй мы пойдзем па шляху далейшай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Бо пытаньне паказу, пытаньне ўзорнай работы калгасаў зараз зьяўляецца актуальным пытаньнем у справе далейшай калектывізацыі. У сувязі з гэтым пытаньне аб кадрах для калгасаў паўстае ва ўсёй шырыні. Трэба рэальна падумаць над тым, каб пры калгасных цэнтрах стварыць цэлую сыстэму курсаў па падрыхтоўцы работнікаў для калгасаў. Трэба паставіць пытаньне аб тым, каб арганізаваныя курсы працавалі сыстэматычна і падрыхтоўвалі калгасныя кадры.

Побач з гэтым трэба мець на ўвазе, што партыйная работа ў вёсцы зараз надзвычай складаная, таму аб кадрах для нізавых партыйных арганізацый вёскі нам трэба сур'ёзна падумаць і паставіць пытаньне практычна аб падрыхтоўцы партыйных кадраў для вясковых арганізацый.

Апошняе пытаньне, на якім я хачу сказаць пару слоў, — гэта вэйсковая небясьпека і падрыхтоўка да абароны краіны. У гэтай рабоце мы за апошні перыяд маем рад посьпехаў. Але нам трэба гэту работу яшчэ больш узманіць, праводзіць яе сыстэматычна, штодзенна. Асоавіяхім працуе слаба, асабліва ў вясковых раёнах. Вясковыя парторганізацыі павінны ўзманіць сваё кіраўніцтва работай Асоавіяхіму.

Прамова тав. Шпэктарава

Таварышы! Раённыя і акруговыя канфэрэнцыі далі верную ацэнку дзейнасьці ЦК, прызнаючы палітычную лінію ў рабоце ЦК правільнай. У мяне адносна гэтага няма ніякіх сумненьняў.

З прычыны нястачы часу, я хацеў-бы спыніцца на двух пытаньнях: на пытаньні барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам, яўрэйскім шавінізмам і на пытаньні аб ацэнцы выступленьня асобных таварышоў.

У адным з карэнных пытаньняў нашай работы тав. Араніштам выказаў сваё сумненьне — у пытаньні аб барацьбе з нацыянал - дэмакратызмам, заявіўшы, што мы тут мелі спуск на тормазах. Гэта бясспрэчна зьяўляецца паклёпам на пап ЦК, гэта зьяўляецца няверным выступленьнем. Увесь год з XII зьезду быў годам самай упартай барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам. Тут такія факты, як тэатральная дыскусія, як выступленьне Жылуновіча, як выключэньне яго з партыі, ліст трохпісьменьнікаў, барацьба з гэтымі фактамі, вылазка Зарэцкага, выключэньне Зарэнкага з партыі, вылазка ў часе пяцігодзьдзя Белдзяржвыдавецтва, зьняцьце кіраўніцтва БДВ, дыскусія аб мове, рэзкі ўдар па нацыянал - дэмакратах Лёсіку і кампаніі, — гэта бясспрэчна факты, якія гавораць аб тым, што ЦК за ўвесь апошні год вёў самую актыўную і рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам. Тут тав. Араніштам сказаў, што нацыянал - дэмакратызм ня вош, яго пазногцем не раздушыш. Гэта трэба было яму ўлічыць, калі ён аб гэтым гаварыў. Мы мелі ня спуск на тормазах у справе барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам, а мы мелі бясспрэчна неаслабны ўдар і з дня ў дзень на нацыянал - дэмакратызьме. Мы зараз на фоне абвастрэньня клясавай барацьбы бясспрэчна будзем мець ажыўленьне, узмацненьне нацыянал - дэмакратызму ў нашай краіне і партыя пад кіраўніцтвам свайго ЦК будзе біць, як і біла, з патроснай сілай на контр - рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызьме, на шавінізмах усіх масьцей.

Мы на глебе асобных перагібаў у падатковай палітыцы, на глебе асобных перагібаў у адносінах да мястэчка маем ажыўленьне яўрэйскага шавінізму, але нельга абагульваць асобныя перагібы ў агульную лінію, у агульную канцэпцыю, якую нібы праводзіў наш ЦК партыі. Гэта няверна, гэта трэба рашуча асуджаць.

Факты ажыўленьня яўрэйскага шавінізму мы маем на радзе вучасткаў і бясспрэчна будзе правільна, калі наш зьезд заліша аб неабходнасьці большага ўзмацненьня барацьбы з яўрэйскім шавінізмам.

Нельга ў гэтай сувязі адмяжоўваць Вэйліна ад нацыянал - апартуністычных памылак Яўбюро ЦК КП(б)Б, гэта будзе няправільна. ЦК факты нацыянал - апартунізму выявіў, ён вёў барацьбу і нельга патрабаваць ад ЦК таго, каб ён сабе прыпісаў тое, з чым ён вёў яўную і рашучую барацьбу за ўвесь апошні год.

Цяпер — адносна барацьбы з правааўхілісцкімі поглядамі тав. Чарвякова. Таварышы ня маюць рацыі, калі ставяць пытаньне, што калі тав. Чарвякоў прызнаў свае памылкі, дык мы можам супакоіцца. Гэта няверна. Памылкі тав. Чарвякова былі не выпадковыя, яны мелі глыбокія сацыяльныя карэньні. Адным прызнаньнем іх на словах мы сёньня ня можам абмежавацца. Мы — партыя палітычная і нам трэба на справе правяраць тых, хто памыліўся, трэба каб тав. Чарвякоў на справе даказаў, наколькі ён будзе правільна праводзіць лінію партыі, наколькі ён будзе змагацца з правым ухілам і з нацыянал-апартунізмам. Толькі шляхам праверкі на справе мы зможам пераканацца ў сапраўдным выпраўленьні памылак, якія тав. Чарвякоў дапусьціў.

Другое пытаньне. У чым сэнс крытыкі памылак тав. Васілевіча, мы гаворым, што трэба змусіць задумацца над асобнымі памылкамі, над тым, куды яны могуць урэшце, прывесьці. Трэба выпраўляць гэтыя памылкі, трэба на памылках асобных таварышоў выхоўваць мясцовыя кадры, выхоўваць нашы арганізацыі. Мы ня лічым, што ў тав. Васілевіча ёсьць ужо цэлая сыстэма няправільных поглядаў. Гэта было-б няверна.

Якія-ж асобныя памылкі былі ў тав. Васілевіча, пры яго ў асноўным правільнай лініі? Мы мелі з боку тав. Васілевіча такія выступленьні: «У акругах Беларусі амаль няма кулацкіх гаспадарак, а калі ёсьць, то толькі ў некаторых акругах».

Тав. Васілевіч у сваім выступленьні на пленуме ЦК ЛКСМБ сказаў: «Не ў інтарэсах серадняка, дробнага ўласьніка, будаўніцтва калгасаў». «Барацьба з перагібамі ёсьць манэўр» — у прамове па Фрунзаўскай партканфэрэнцыі. Бясспрэчна, што аб такіх асобных памылках я лічу сваім абавязкам сказаць. Кожны з нас, кожны член партыі, гаворачы аб памылках, можа так гаварыць аб памылках другога таварыша. Інакш мы ня можам выхоўваць нашу партыйную арганізацыю.

(Голас: Якія памылкі былі ў тав. Васілевіча ў рабоце?)

Я кажу: будзе няверна, калі пасьля моўных месца тут выступленьняў, асобныя таварышы прыпішуць іх нейкай групавой барацьбе. Гэта будзе ў корані няверна, быццам тыя таварышы, якія тут выступаюць, займаюцца групавой барацьбой.

Вынік такой крытыкі памылак нашага кіруючага таварыша ёсьць пасьледак таго росту партыйнай арганізацыі, які мы мелі пад кіраўніцтвам нашага Цэнтральнага Камітэту.

ЦК КП(б)Б праводзіў бясспрэчна верную лінію, але асобныя кіруючыя таварышы пры агульнай сваёй вернай лініі могуць мець памылкі.

Выпраўляючы гэтыя асобныя памылкі, дапамагаючы таварышом пры іх, у агульным правільнай лініі, выпраўляць свае асобныя памылкі, КП(б)Б, праводзячы цьвёрда генэральную лінію, даб'ецца ягчэ больших посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Прамова тав. Куцякова

У спрэчках, памойму, повыстарчальная ўвага аддаецца пытаньням сацыялістычнага разьвіцьця прамысловасьці і абароназдольнасьці нашае краіны. Нам, вайсковым камуністым, хацелася-б чуць больш аб тым, як справа абстаіць на нашых прадпрыемствах з выкананьнем задачы па разьвіцьці прамысловасьці, з выкананьнем пяцігодкі за чатыры гады, з выкананьнем прамфінпляну. У нас у Віцебску 21 прадпрыемства, а за другі год пяцігодкі прамфінплян выканалі толькі два прадпрыемствы. Гэта высоўвае перад намі задачу, што пытаньням выкананьня прамфінпляну мы павінны надаць вялізарнае значэньне.

Сацыялістычнае спаборніцтва і разьвіцьцё ўдарнага руху на радзе прадпрыемстваў праводзіцца дрэнна. Толькі каля 50 проц. камуністых і камсамольцаў, якія працуюць на фабрыках, зьяўляюцца ўдарнікамі і садзейнічаюць пасьляховаму разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва. Ягчэ ня ўсе камуністы і камсамольцы, якія працуюць на фабрыках, сталі на чале беспартыйных мас, не зьяўляюцца ўзорам у справе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Як ня дзіўна, а па нашай Віцебскай арганізацыі сярод ударнікаў налічваецца каля 70 проц. жанчын, а мужчыны, нават камуністы і камсамольцы, у гэтай справе адстаюць ад жанчын. Нам трэба глыбока прааналізаваць работу па выкананьні прамфінпляну, падагуліць гэту работу і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па яе замацаваньні.

Калектывізацыя вёскі стаіць перад намі, як адна з важнейшых задач. Выкананьне гэтай задачы, пасьляховае ажыцьцяўленьне немагчыма без напружанай сыстэматычнай работы сярод беднаты. Без гэтай работы мы ня можам чакаць посьпехаў у справе разгортваньня калектывізацыі.

Пытаньне ваяннізацыі рабочых, камсамолу, працоўных мас сялянства заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі. Да гэтага часу справа ваяннізацыі была пастаўлена дрэнна і таму ў будучым нашы мясцовыя партыйныя арганізацыі як у гораде, так і ў вёсцы павінны ўзмацніць сваю работу па кіраўніцтве ваяннізацыяй рабочага насельніцтва.

Прамова тав. Крылова

Таварышы, у рабоце па калектывізацыі сельскай гаспадаркі памі дагушчан рад памылак і ў Цэнтральным Камітэце, і ў акруговых раённых камітэтах. Усе арганізацыі гэтыя памылкі прызналі Гэта, зразумела, добра. Але ці ўсе арганізацыі ў дастатковай ступені гэтыя памылкі крытыкавалі. Сёньня трэба гэта прааналізаваць

Я лічу, што рад нашых арганізацый, у тым ліку і рэдакцыя газэты «Зьвязда» недастаткова крытыкавалі свае памылкі. Возьмеце, напрыклад, «Зьвязду»: калі яна рабіла памылкі, дык гэтыя памылкі пісаліся аграмаднымі лёзунгамі, але калі трэба было гэтыя памылкі па-бальшавіцку крытыкаваць, то тут духу ў «Зьвязды» не хапіла крытыкаваць з такім энтузіязмам свае памылкі, як мы гэта робім у сучасны момант. Мы ня бачым дастатковай крытыкі з боку нашага кіруючага органу друку—«Зьвязды» у адносінах сваіх уласных памылак.

Калі ўзяць пытаньне адносна Цэнтральнага Камітэту, дык трэба сказаць, што, вядома, нельга будавань тут крытыку так, каб яна была накіравана на дыскрэдытацыю партыйнага кіраўніцтва, але крытыкаваць усе ўласныя памылкі неабходна ў дастатковай меры, а мы гэтага ня бачым.

Прамова тав. Каравіна

Ня гледзячы на рад дасягненьняў, якія мы маем у нашай рабоце ў перыяд ад XII да XIII зьезду нашай партыі і ў пытаньнях будаўніцтва нашай краіны, у пытаньнях калектывізацыі і ў іншых пытаньнях, усё-ж, таварышы, наша партыйная арганізацыя на XIII зьезд прышла з некаторымі мінусамі, з мінусамі ў тэй рабоце, на якой была ясная лінія Цэнтральнага Камітэту нашай партыі. Тут, таварышы, намойму да некаторай ступені сталі перасольваць. У ранейшых і ў наступных выступленьнях таварышы выхватвалі асобныя сказы, асобныя памылкі, я-б сказаў, не памылкі, калі-б прачыталі да канца, а выхватвалі асобныя словы, на якіх будавалі цэлую канцэпцыю памылак. Мне думаецца, што перш чым пачаць крытыку, трэба паглядзець на сябе, што мы самі зрабілі. (Шум у залі).

Памойму, гэта правільна, што ў пытаньнях калектывізацыі... (голас з месца: мы свае памылкі таксама крытыкавалі).

Не, мы свае памылкі дастаткова не крытыкавалі, а калі крытыкавалі, дык трэба і тут крытыкаваць. Вось мы аб сабе мала гаворым і, калі ў некаторых таварышоў спытаюцца: «чаму не сказаў аб сваіх памылках?» то ён, сходзячы з трыбуны, пачынае гаварыць аб сваіх памылках.

У чым асноўны корань памылак у пытаньнях калектывізацыі на мясцох? У тым, што мы недастаткова палітычна падрыхтаваліся, што наш актыў, які ўзяўся праводзіць гэту работу, надзвычай важную палітычную работу, у дастатковай ступені ня ведаў таго вучэньня, аб чым гаварыў Ленін. У дастатковай ступені ў нас былі дырэктывы Цэнтральнага Камітэту партыі аб тым, як праводзіць гэту работу. А ці выконвалі мы гэтыя дырэктывы? Не, ня выконвалі. І калі гаварыць, што вінават тут Цэнтральны Камітэт, а мы застаемся збоку, дык гэта няверна.

Аб выкананьні нашага прамфінпляну. У нас ёсьць дасягненьні, але на некаторых прадпрыемствах мы на сёньня маем прарывы, і я думаю, што Цэнтральны Камітэт павінен прызнаць партыйныя арганізацыі для таго, каб ліквідаваць гэтыя прарывы. Бяда ў тым, што мы ягчэ ня маем зараду, што наш «трыкутнік» не адпавядае тым патрабаваньням, якія пастаўлены перад намі. Я думаю, што XIII зьезд прыме адпаведную пастанову ў гэтым пытаньні.

Апошняе пытаньне аб кадрах. Калі мы гаворым аб кадрах, калі мы прымаем адпаведныя меры ў адносінах упарадкаваньня навучальных устаноў, укамплектаваньня іх і г. д., дык давайце паглядзім, што робіцца ў нас з моладзьдзю, асабліва на сяле. Тав. Васілевіч у сваім дакладзе падкрэсьліў, што кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэту КСМ у дастатковай ступені было кепскім. Гэта кіраўніцтва было недастатковым і гэта—факт.

Прамова тав. Сысоева

Тыя вялізарныя задачы, якія стаяць перад партыяй па вёсцы: сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як клясы, вымагаюць узмацненьня нашых вясковых партыйных арганізацый як па лініі кіраўніцтва, так і па лініі пасылкі рабочых камуністых у вёску. Зьезд на гэту акалічнасьць павінен зьвярнуць вялікую ўвагу, павінен будзе вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаваньні вясковых партыйных арганізацый.

Другое пытаньне — гэта адносна тэарытычнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі тых кадраў работнікаў, якія працуюць на вёсцы. Ужо ня раз канстатавалася аб тым, што батрацка - бяднацкія масы вёскі значна вырасьлі і часамі стаяць па сваім разьвіцьці вышэй некаторых вясковых камуністых. Гэта патрабуе неадкладных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы вясковых камуністых для далейшай работы па ажыцьцяўленьні задач партыі на вёсцы.

Нашы вясковыя хаты-чытальні працуюць вельмі дрэнна. Кіраўнікамі хаты-чытальнь часамі пасылаюцца слаба падрыхтаваныя таварышы, у дадатак да гэтага вясковых палітасьветнікаў дрэнна забясьпечваем матар'яльна.

І апошняе, што трэба падкрэсьліць—гэта тое, што на будаўніцтва ў калгасах адпускаюць надзвычай малыя сумы грошай. Напрыклад, на набудову хлява для 200 штук жывёлы адпускаюць 3.500 руб. За гэтыя сродкі бязумоўна такога будынку нельга набудаваць. Трэба адпаведным арганізацыям аддаць максымум увагі гаспадарчаму замацаваньню калгасаў у прыватнасьці будаўніцтву ў калгасах.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

Ранішняе пасяджэньне 10 чэрвеня пачалося заключнымі прамовамі т. т. **Галадзеда і Рачыцкага.**

Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладах т. т. Галадзеда і Рачыцкага зьездам абрана камісія ў наступным складзе: т. т. **Галадзед, Рачыцкі, Чарвякоў, Балцін, Міцькоў, Красоўскі, Ластоўскі, Масюкоў, Дубіна, Каранеўскі, Бойка, Караленка, Хатаненка, Ваўковіч, Яфімаў, Боскатаў, Азаронак, Райсін, Юхневіч, Акраменка, Саламонаў, Раманенка, Казлоўскі, Хандогі, Рашотнікаў, Манжалей, Стрыга, Янковіч, Хіваў, Нахільніцкі, Качук, Каржэвіч, Майсееў, Сурба, Сасноўскі, Мяжуеў, Грыбаў, Лаціс, Цімашэнка, Бачароў, Зальдовіч, Сьцяпанаў, Рахманаў, Кухаркін, Шпак, Маркаў, Плушчаеў, Карпека, Барысевіч і Матус.**

На ранішнім пасяджэньні быў таксама заслуханы даклад т. **Рыжова аб задачах прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд.**

У спрэчках выступілі т. т. **Бэрзінг, Кац, Тамкоў, Палачоў, Мазур, Зыльбэрман, Аляксееў і Самусенка.**

На вячэрнім пасяджэньні працягваліся спрэчкі па дакладу т. Рыжова. У спрэчках выступалі т. т.: **Манжалей, Плятнёў, Калодка, Хаскін, Аскерна і Круглікаў.**

З заключнай прамовай на вячэрнім пасяджэньні выступіў т. **Рыжоў.**

Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу т. Рыжова зьезд абраў камісію з наступных т. т.: **Рыжоў, Хаскін, Кохан, Левін, Плятнёў, Балцін, Манжалей, Калодка, Саламонаў, Аверын, Захарава, Рэмізэвіч, Вазялеўскі, Гасьперскі, Эпштэйн, Каган, Самусевіч, Газ, Гаруновіч Катляраўскі, Сапун, Жан, Гофман, Кац, Хасман, Палачоў, Зальдовіч, Піліпёнак, Шпэктараў, Камэнштэйн, Шоламаў, Левін, Васкабойнікаў, Шулькін, Супрановіч, Бланштэйн, Альтман, Чорны, Дзяціна, Гэлер, Дзьмітровіч, Грынбэрг, Новікаў, Смаль, Рапапорт і Бэрхін.**

А 7 гадз. веч. адбылася дэманстрацыя піянэраў г. Менску ў гонар XIII зьезду КП(б)Б. Піянэры калектыўна віталі зьезд.

Для адказу на прывітаньні піянэраў зьездам вылучана дэлегацыя ў наступным складзе: т. т. **Галадзед, Аранштам, Лаціс, Палякоў, Карпаў, Самойлаў і Гайдукевіч.**

На вячэрнім пасяджэньні зьезд вітала таксама дэлегацыя ад зьлёту ўдарных брыгад Дзяржынскага раёну (Гомельшчына). З прывітаньнем зьезду выступіў

ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПЛЯЦФОРМА

(АБ АРТЫКУЛЕ МАМАЕВА)

У сувязі з надыходзячым XVI партзьездам, правыя і «левыя» ажыўляюць сваю дзейнасьць. Правыя ўхілістыя і «левакі» ўзмацняюць свае атакі на генэральную лінію партыі і яе Цэнтральны Камітэт, яны прабуюць свае сілы для новых нападаў на партыю.

Ад замаскаваных вылазак, прыкрытых двуліцаю абалонкаю знадворнай лёяльнасьці, завуаляваных фальшывай, двурушніцкай згодай з палітыкай партыі, правыя прабуюць скаласіць прадзьездаўскую пляцформу, яны супроцьстаўляць генэральнай лініі партыі і яе Цэнтральнаму Камітэту разгорнутую праграму сваіх капітулянцкіх, апартуністычных поглядаў, якія адлюстроўваюць мары і жаданьні кулака і нэпмана.

Зьездаўскую дыскусію правыя ўхілістыя ўсё больш настойліва імкнуцца выкарыстаць для таго, каб публічна прапагандаваць свае «тэорыі», каб у выглядзе прадзьездаўскіх «дакумантаў» выставіць сваю пляцформу, сваю праграму супроць лініі партыі.

Мы лічым патрэбным спыніцца на артыкуле Мамаева «К XVI с'езду партіи», зьмешчаным у **«Правде»** («Дискуссионный листок» № 9, «Правда» от 9 июня № 157).

Гэты артыкул — прадзьездаўскі «дакумант» зьяўляецца па сваёй сутнасьці пляцформай правых да XVI зьезду партыі. Мамаеў у сваім артыкуле, нахабна спэкулюючы на цытатах з твораў т. т. Леніна і Сталіна, разгортае цэлую праграму антыпартыйных, праваўхілісцкіх поглядаў, накіраваных на дыскрэдытацыю генэральнай лініі партыі, на дыскрэдытацыю яе ленінскага бальшавіцкага кіраўніцтва.

Сваю атаку супроць партыі Мамаеў пачынае з цьверджаньня, быццам, пункт тэзісаў тав. Якаўлева, дзе гаворыцца, што «середняк об'единившись добровольно пошел в колхоз», зьяўляецца ілжывым.

Адмаўляючы бясспрэчны факт масавага добраахвотнага руху сярэдняка ў калгасы, Мамаеў у пацьвярджэньне сваёй думкі заяўляе, што:

— «Раскулачивание доходило весной 1930 года до 15 проц. и лишенных избирательных прав — до 20 проц.».

Адсюль Мамаеў робіць вывад, што «вопрос о добровольности отходит в сторону».

Гэты манэўр пашыты белымі ніткамі. Мамаеў антысярэдняцкія перагібы і скрыўленьні, дапушчаныя ў наасобных мясцох, узводзіць у лінію партыі па калгасным будаўніцтве, старанна затушоўваючы і абходзячы моўчкі бязумоўны факт пераходу асноўных мас сялянства на рэйкі калектывізацыі, факт цьвёрдага і рашучага павароту сярэдняка да сацыялізму.

Мамаевы і яму падобныя, скарыстоўваючы памылкі і перагібы «левых» загібшчыкаў у мэтах дыскрэдытацыі партыйнай лініі, заплюшчваюць вочы на сапраўднасьць сёнешняга дня.

У асноўных збожжавых раёнах Савецкага Саюзу мы маем на сёньня 50-60 проц. зямельнай плошчы пад замаванымі калгасамі. Рэзультатам гэтых посьпехаў у калектывізацыі зьяўляецца тое, што **ў бягучым годзе калгасы разам з саўгасамі дадуць асноўную частку таварнай збожжавай прадукцыі.** Кожны дзень тэлеграф прыносіць усё новыя і новыя весткі аб тым, што асноўная маса калгасаў з посьпехам праводзіць веснавую сяўбу і **перавыконвае** пасеўныя пляны.

«На 1-га мая 1930 г. у асноўных збожжавых раёнах вытвараючых абласьцей калектывізацыя ахапіла 40-50 проц. сялянскіх гаспадарак замест 2-3 проц. гаспадарак вясной 1928 г., а пасеўная плошча калгасаў па СССР з 1,5 млн. гэктараў вясной 1928 г. узьнімаецца, як гэта і прадугледжвалася настановай Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) ад 5-га студзеня, прыкладна, да 30-35 млн. гэктараў вясной 1930 г., ня лічачы азімага кліну. У рэзультаце гэтага калгасы разам з саўгасамі ўжо ў бягучым 1930 г. дадуць асноўную частку таварнай збожжавай прадукцыі ў адрозьненне ад пэрыяду XV зьезду і XVI канфэрэнцыі, калі пераважная частка таварнай збожжавай прадукцыі вытваралася індывідуальнай сялянскай, у тым ліку і кулацкай гаспадаркай. Такім чынам, партыя вырашае на справе асноўную і труднейшую праблему сельскай гаспадаркі — збожжавую праблему» (тэзісы тав. **Якаўлева**).

Серадняк цьвёрда і рашуча становіцца на рэйкі калектыўнай гаспадаркі, **«карэнны паварот вёскі да сацыялізму можна лічыць ужо забясьпечаным»** (Сталін).

Наперакор гэтым фактам Мамаеў займаецца наглай хлусьнёй, паўтараючы ўсе бессэнсоўныя выдумкі клясавага ворага, што серадняковуў «согнали в колхозы».

Сутнасьць далейшых разважаньняў Мамаева ў асноўным зводзіцца да таго, што мы яшчэ «не созрели» для калектывізацыі, што ўзровень тэхнікі і прамысловасьці не дазваляе разгарнуць калгаснае будаўніцтва, што мы яшчэ ня маем «достаточной технической базы, которая-бы стимулировала переход бедняка и середняка от коллективной обработки земли к машинному механизированному хозяйству».

«А можно ли достигнуть сплошной коллективизации — пытаецца Мамаеў — без машинизации?»

Чаго варты гэтыя пераневы меншавіцкіх «тэорый». Ва унісон з меншавікамі, якія бяспліённа енчаць аб «тэхнічнай адсталасьці Расіі», аб тым, што «ў Расіі будаўніцтва сацыялізму з прычыны першабытнай тэхнікі немагчыма», — Мамаеў прапаведуе, што ў нас няма тэхнічнай базы для рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Старанна затушоўваючы і ігнаруючы рашаючыя посьпехі партыі ў будаўніцтве цяжкай індустрыі, якія дазваляюць партыі шырока разгортваць і ўзмацняць сваю барацьбу за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, Мамаеў проста хоча давесьці, што для калгаснага будаўніцтва мы яшчэ «не созрели», а таму давайце адмовімся ад калектывізацыі.

Лёгічным вывадам «канцэпцыі» Мамаева зьяўляецца праваапартуністычная стаўка на самацёк, на згортваньне і затармажэньне калектывізацыі. А гэта значыць, што канечнай мэтай мамаеўскай «канцэпцыі» зьяўляецца стаўка на буржуазную рэстаўрацыю ў нашым краі.

Не выпадкова, што Мамаеў так квалёфікуе асноўную прычыну меўшага месца аддыву з калгасаў.

— «Кроме того, что нет машинизированной базы, исключая МТС, в колхозах мы не смогли охватить организационно ту массу крестьян (середняков), которую «согнали в колхозы».—Вот основная причина отлива».

Для аргумэнтацыі сваіх наклёпніцкіх выпадаў супроць партыі Мамаеў карыстаецца ўсякімі сродкамі. Для таго, каб дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі і яе Цэнтральнага Камітэту, каб угрунтаваць сваю апартуністычную байку аб «размычцы» з серадняком, Мамаеў абвінавачвае партыю ў тым, што яна праводзіла трацкісцкую лінію.

Нам добра знаёмы гэтыя хітрыкі правых апартуністых. Мы ня раз былі сьведкамі, калі правыя ўхілістыя ў сваёй барацьбе супроць партыі абвінавачвалі партыю і ЦК у «правядзеньні трацкісцкай палітыкі». Правыя заяўлялі, што партыя, прыкрываючыся барацьбой з правым ухілам, ажыцьцяўляе на практыцы тэорыі трацкістых.

Гаворачы аб рабоце мясцовых арганізацый на калгасным будаўніцтве, Мамаеў піша:

«Увлекшиеся в борьбе, так сказать, с правым уклоном, незаметно для себя перешли на платформу «левых», разумеючы пад словам «увлекшиеся» партыйныя арганізацыі, усю партыю.

Усе свае выпады супроць лініі партыі Мамаеў канцэнтруе ў адным мэтамімкненьні дыскрэдытаваць Цэнтральны Камітэт. З улясьцівай апартуністым выкручлівасьцю, ён у сваім артыкуле рознымі мэтадамі атакуе ленінскую палітыку Цэнтральнага Камітэту партыі. Мамаеў пускае ў ход добра знаёмыя ўжо партыі спосабы, ставячы пытаньне аб тым «у кого-же закружилась голова», разважаючы аб тым, што «кем-то не было предусмотрено»... Паводле Мамаева, вышэйшыя партыйныя органы рабілі перагібы і скрыўленьні, а потым за ўсё адказвалі нізавыя партыйныя работнікі. Мамаеў выступае ў абарону «левакоў».

— «Окружные и краевые грешили, а «стрелочников» судили и стращали всем, чем хочешь, за «перегибы».

Мамаеў працягвае руку «леваком», Мамаеў блёкіруецца з «левымі» апартуністымі, каб яшчэ больш узмацніць сваю атаку на генэральную лінію партыі і яе бальшавіцкае кіраўніцтва.

Партыя біла і будзе біць правых апартуністых, якія, скарыстоўваючы памылкі і перагібы «левых» загібшчыкаў, прабуюць дыскрэдытаваць кіраўніцтва партыі. Цэнтральны Камітэт у сваіх пастановах ня раз сваячасова папярэджваў партыйныя арганізацыі аб недапушчальнасьці пікага адміністраваньня і камандаваньня ў калгасным руху. ЦК у сваіх пастановах (на лістападаўскім пленуме ЦК, пастанова ад 6-га студзеня 1930 г., артыкулы тав. Сталіна і г. д.) рашуча завастраў увагу партыйных мас на задачы пільна захоўваць ленінскі прынцып добраахвотнасьці калгаснага руху. І ўсякія спробы Мамаевых падарваць аўтарытэт Цэнтральнага Камітэту, дыскрэдытаваць ленінскую палітыку ЦК нямінуча закончацца поўным крахам.

Далей Мамаеў разьвівае сыстэму поглядаў, сутнасьць якіх заключаецца ў тым, каб «давесьці», што калектывізацыя — шлях да дэградацыі сельскай гаспадаркі, да зубожаньня сялянства.

Харчовы «крызис» у краі Мамаеў тлумачыць масавымі рэпрэсіямі ў адносінах да сераднякоў і беднякоў. Для нас зусім ясна, што вуснамі Мамаева гаворыць агент кулацка - нэпманскіх элемэнтаў, што вуснамі Мамаева гаворыць клясавы вораг. Тут мы маем перапеў на новы лад старых нагудак правых апартуністых аб тым, што калгасы і саўгасы не зьяўляюцца «столбовой дорогой» да сацыялізму, не зьяўляюцца асноўным і рашаючым спосабам вырашэньня збожжавай праблемы ў нашым краі.

Для таго, каб давесьці «няправільнасьць» палітыкі партыі, Мамаеў пускаецца яшчэ на адзін трук. Гаворачы аб пастановах лістападаўскага пленуму, ён яхідна заяўляе, што, моў, «постановляем одно, а на деле проводим другое».

Ня трудна ўбачыць за гэтымі заўвагамі выступленьне супроць новых лёзунгаў партыі, супроць палітыкі партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Далейшыя разважаньні Мамаева ў яго артыкуле зводзяцца да паўтарэньня старых наклёпніцкіх абвінавачаньняў партыі ў «перагражэньні» і г. д.

— Сегодня проводим одно, завтра с таким же успехом, отменяем, и наши законы, не говоря уже о политике, превращаются в нечто подобное белым перчаткам парламентского буржуазного чиновника.

Гэта—брудны, подлы паклёп на генэральную лінію нашай партыі на ленінскую палітыку Цэнтральнага Камітэту. Як дакладна сходзіцца цынічная хлусьня Мамаева з тымі паклёпамі, якія штодзённа льюць на нашу партыю, на Савецкі Саюз пісакі замежнага фашысцкага і сацыял - фашысцкага друку. Гэтымі днямі **«Кур'ер Віленскі»** (віленская фашысцкая газэта) пішучы аб палітыцы камуністычнай партыі на вёсцы, называе гэту палітыку «палітыкай зьгзагаў».

Для нас зусім ясна, што ўсе «тэорыі» і «тэорыйкі» Мамаева зьяўляюцца паўтарэньнем і далейшым разьвіцьцём старых поглядаў правага апартунізму, несумяшчальных, як пастанавіў лістападаўскі пленум ЦК, з прабываньнем у радах УсеКП(б).

У сваім артыкуле Мамаеў адкрыта салідарызуецца з лідэрамі правага ўхілу. У сваіх антыпартыйных, праваўхілісцкіх «разважаньнях» Мамаеў апіраецца на іх выказваньні і погляды.

Партыя ня можа прайсьці міма таго факта, што былыя лідэры правай апазыцыі маўчаць, калі правыя апартуністыя ў сваіх антыпартыйных выступленьнях адкрыта спасылаюцца на іх. На лістападаўскім пленуме лідэры правых былі прымушаны пад націскам партыі і ЦК капітуляваць перад партыяй. Зараз яны займаюць пазыцыю падазронага чаканьня, яны ня выказваюць сваіх поглядаў па аспоўных пытаньнях палітыкі партыі.

Вуснамі Маскоўскай абласной партыйнай канфэрэнцыі, партыя «патрабуе ад былых лідэраў правых апартуністых разгорнутай бальшавіцкай крытыкі сваіх апартуністычных памылак і рашучай і актыўнай барацьбы супроць усякіх спроб правых ухілістых рэвізаваць ленінскую генэральную лінію партыі, супроць усякіх наскокаў і дыскрэдытацыі ленінскага кіраўніцтва партыі — Цэнтральнага Камітэту і яго палітыкі» (з рэзалюцыі 2-й Маскоўскай абласной канфэрэнцыі па справаздачы ЦК УсеКП(б).

***

Партыя ідзе да свайго XVI зьезду маналітнымі радамі, згуртаваная вакол Ленінскага Цэнтральнага Камітэту. Загартаваная ў непрымірымай барацьбе з апартунізмам, партыя падагульвае рэзультаты сацыялістычнага будаўніцтва за пройдзены этап ад XV да XVI зьезду. Наша партыя нікому не дазволіць падрываць сваю гіганцкую гістарычную работу. Бязьлітасны адпор атрымаюць усякія апартуністычныя наскокі на генэральную лінію партыі. Праводзячы жорсткую барацьбу з правым ухілам, які застаецца галоўнай небясьпекай, з «левым» апартунізмам партыя біла і будзе бязьлітасна біць па ўсякіх спробах рэвізаваць асновы ленінізму, па ўсякіх спробах справа і зьлева атакаваць генэральную лінію партыі і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэту.

XIII зьезд КП(б)Б праходзіць пад знакам непрымірымай барацьбы на два фронты, з правым ухілам — галоўнай небясьпекай, з «левымі» загібшчыкамі—саюзьнікамі правых, з рэшткамі контрэвалюцыйнага трацкізму.

Зьезд, абмеркаваўшы справаздачу Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) цалкам і поўнасьцю **ўхваліў** палітычную лінію і практычную работу Цэнтральнага Камітэту. XIII зьезд аднадушна падкрэсьліў, што Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) непахісна стаіць на варце генэральнай лініі ленінскай партыі.

Партыйныя арганізацыі Беларусі цясьней згуртоўваючы свае рады навокал ленінскага ЦК давалі і будуць даваць самы суровы адпор усякім апартуністычным наскокам на лінію партыі, усякім спробам правых і «левых» дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва партыі. Бальшавікі Беларусі выкрывалі і будуць бязьлітасна выкрываць кулацкую агентуру ў радах партыі, будуць бязьлітасна біць па мамаевых. Права-апартуністычная «мамаеўшчына» атрымае суровы і жорсткі адпор. Бальшавікі выкінуць з радоў партыі агентуру кулака.

Юр. Т—к.

Мацней агонь па правых апартуністых, якія аднаўляюць свае атакі супроць лініі партыі, супроць ленінскага ЦК

Не паслабляць барацьбы на два фронты, барацьбы за генэральную лінію партыі

Спроба правых дыскрэдытаваць Ленінскі ЦК

Ажыўленьне, якое зараз наглядаецца, сярод правых перад XVI партзьездам, знаходзіць водгук у радзе некаторых ячэек Віцебску. Пры прапрацоўцы тэзісаў т. Якаўлева мы мелі праваапартуністычнае выступленьне асобных камуністых на сходзе ячэйкі Дзяржбанку, гарадзкога камітэту ўзаемадапамогі.

Выступленьні партыйцаў Таўкачова і Емяльянава на сходзе ячэйкі Дзяржбанку зьявіліся адбіткам апошніх «мэтадаў» правых: скарыстаць асобныя «левыя» загібы, скажэньні лініі партыі на мясцох пры правядзеньні калектывізацыі для таго, каб зьвесьці ўсё да памылак ЦК УсеКП(б) і яе цэнтральнага органу «Правды».

Тав. Таўкачоў кажа: «у перагібах вінаваты на-палову нізы, а на-палову вышэйшыя партыйныя інстанцыі. Цэнтральны орган партыі «Правда» несвячасова сыгналізаваў аб перагібах».

Тав. Емельянай пайшоў далей. «Памылкі рабіла ўся партыя, у тым ліку і ЦК, калі ў апчалкасе ненармальнасьці —хто адказвае, загадчык ці працаўнік?» Член бюро ячэйкі камсамолу, кандыдат акругкому КСМ т. Левіна поўнасьцю выявіла абыватальскія настроі, ставячы пытаньне: «чаму няма масла, кампоту, куды падзеліся ўсе тавары?» А тав. Емяльянай дадаў: «чаму бастон ёсьць па 35 рублёў мэтр?»

Характэрны паводзіны гэтых таварышоў на бюро ячэйкі.

Тав. Таўкачоў імкнуўся зьвесьці справу да таго, што ён не абвінавачваў ЦК і «Правду». а ставіў пытаньне, што вінаватасьць павінна быць падзелена паміж сярэднім і ніжэйшым зьвяном.

Емельянаў імкнуўся апраўдацца слабай палітычнай падрыхтоўкай, гаворачы, што ад запіскі ён адмовіўся і што яму тут «прышываюць ухіл» а на заводзе-б проста растлумачылі.

Бюро ячэйкі дало рашучы адпор імкненьню Емяльянава прыкрыцца лёзунгам крытыкі і самакрытыкі: «дык што, нельга крытыкаваць ЦК, а дзе крытыка і самакрытыка?»

Усе гэтыя таварышы, скаціўшыся ў апартуністычнае балота, памылак сваіх на бюро ня прызналі.

Улічваючы тое, што Таўкачоў ужо запраяўленьне правага ўхілу на практыцы ў часе працы ў маляўнічым быў выключаны з партыі, а потым адноўлен з суровай вымовай і папярэджаньнем, бюро ячэйкі пастанавіла выключыць Таўкачова з радоў КП(б)Б.

Емяльянаву абвешчана вымова з пастаноўкай пытаньня на сходзе ячэйкі аб выхадзе яго з кандыдатаў бюро. Адначасова запрапанавана бюро ячэйкі ЛКСМ абгаварыць выступленьне т. Левінай з наведамленьнем акругкому ЛКСМ з тым, каб мабілізаваць увагу ўсёй ячэйкі на барацьбу з правым ухілам.

Партыйная арганізацыя Віцебску дасьць належны адпор усім тым, хто прабуе атакаваць генэральную лінію нашай партыі, дыскрэдытаваць ленінскі ЦК нашай партыі.

Алесь Цыпьштэйн

***

Усе яўныя і скрытыя атакі гэтых апартуністых накіраваны на кіраўніцтва ЦК.

Так было і на ячэйцы Віцебскага гарадзкога камітэту ўзаемадапамогі.

Сваё дэмагагічнае выступленьне старшыня сходу тав. Дзюклёнак пачаў з дымавой завесы, заявіўшы, што нібы памылкі на мясцох пры правядзеньні калектывізацыі рабіліся «левымі» загібшчыкамі, але поруч з гэтым ЦК партыі дапусьціў рад буйных памылак, сваячасова не рэагаваўшы на скрыўленьні і г. д.

Атака на генэральную лінію партыі і ЦК УсеКП(б) з боку Дзюклёнка а потым яго «апраўданьні» у канцы сходу, сутнасьць якіх яшчэ больш выявіла яго апартуністычны твар, выступленьні іншых таварышоў якія прабавалі зрабіць наскок на кіраўніцтва ЦК—атрымалі з боку ўсяго партыйнага сходу рашучы бальшавіцкі адпор.

С. Ч.

РАШУЧЫ АДПОР ВЫЛАЗЦЫ ПРАВЫХ

Бюро парткалектыву Гомельскага заводу „Пралетары" прыняло рашучыя меры ў барацьбе з апартуністычнымі элемэнтамі на заводзе

«Зьвязда» паведамляла аб права-апартуністычных выступленьнях групы камуністых на гомельскім заводзе «Пралетары».

Бюро парткалектыву заводу «Пралетары» прыняло рашучыя меры супроць апартуністычных элемэнтаў. Бюро ячэйкі мэханічнага цэху распушчана, членам яе за тое, што яны не вялі ніякай работы сярод членаў партыі па растлумачэньні сутнасьці правага ўхілу, вынесена вымова. Бюро вылучыла спэцыяльную камісію, якая павінна выявіць прычыны выступленьня групы камуністых супроць арганізацыі камуністычнага цэху.

Гомельская газэта «Палеская Праўда» дае надзвычай характэрныя факты адносна апартуністычнай вылазкі на заводзе «Пралетары». «Члены партыі Гарэлік, Ёфэ, Гурар'е і Рабіновіч зараз сьцьвярджаюць у адзін голас: «гэта-ж сьмешна, калі нас называюць правымі ўхілістымі, мы-ж дрэнна разьбіраемся ў сутнасьці правага ўхілу».

«А што значыць—піша «Палеская Праўда»—калі гэтыя члены партыі, якія, быццам-бы, «не разьбіраюцца», не жадаюць узяць на сябе цяжкі абавязак па арганізацыі камуністычнага цэху і дэзарганізуюць рабочыя масы, калі гэтыя члены партыі авансам заяўляюць, што «ў чэрвені прамфінплян мы ня выканаем», выстаўляючы пяснючыя прычыны. Што значыць калі члены партыі, якія «не разьбіраюцца» гаворыць, што «мы гвалтам насаджваем камуністычныя цэхі і што гэта ня ёсьць вынік актыўнасьці рабочае клясы».

У довад таго, як апартуністычнае кіраўніцтва мэханічным цэхам не вядзе барацьбу з недахопамі цэху, «Палеская Праўда» падае наступны прыклад: у гадавіну праверкі сацыялістычнага спаборніцтва ўсе цэхі выставілі ілжэ-ўдарні каў, прагульшчыкаў, парушальнікаў працоўнай дысцыпліны на чорную дошку. Мэханічны цэх ня даў ні аднаго чалавека. «У нас усё спакойна, у нас ўсё ў парадку».

А калі ўсё ў парадку, дзе-ж прычыны нежаданьня абвясьціць сябе камуністычным цэхам?

Самакрытыка групай апартуністых разумеецца так: раз партыя выкрывае іх апартуністычную практыку, дык гэта зацік самакрытыкі (выступленьні членаў партыі Гарэліка, Гурар'е і Ёфэ). Член партыі Ёфэ гаворыць: «Я заўсёды скажу тое, што думаю, я, а ня тое, што думае нехта». Хто-ж гэта хтосьці, ці не на партыю памякае Ёфэ, які «не разьбіраецца».

Пастанову бюро партыйнага калектыву гэта група ня толькі ня выконвала, а адкрыта выступала супроць гэтае пастановы і адмаўлялася праводзіць у цэху работу па ўдягненьні беспартыйных рабочых у рады партыі.

Парткалектыў заводу «Пралетары» са ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю дасьць адпор гэтым апартуністым. Калектыў павінен патрабаваць ад гэтай групы неадкладна прызнаць свае памылкі і разам са ўсім калектывам змагацца з труд насьцямі і перамагаць іх разам з масамі, на чале мас.

Б. З.

Апартуністычнае выступленьне ў ячэйцы абутковай фабрыкі

Ячэйка дала аднадушны адпор антыпартыйным вылазкам

Адкрыты зьменны партсход Менскай абутковай фабрыкі абмеркаваў тэзісы тав. Шверніка аб задачах прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд. У часе абмеркаваньня выступіў **Шуляк**, які імкнуўся давесьці, быццам, «прафсаюзы ў сучасны пэрыяд непатрэбны», быццам яны «ужо зжываюць сябе» і г. д.

Партыйны сход даў аднадушны адпор гэтаму апартуністычнаму выступленьню, якое адмаўляе вялізарную ролю прафсаюзаў у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Пытаньне аб апартуністычным выступленьні Шуляка было абмеркавана на бюро фабрычнага парткалектыву. Бюро са ўсёй рашучасьцю асудзіла выступленьне Шуляка. Бюро палкрэсьліла, што гэта выступленьне не зьяўляецца выпадковым. Шуляк выказваў такія думкі і раней.

На па-зачарговым партыйным сходзе ўсяго калектыву было абмеркавана гэта пытаньне. Сход цалкам ухваліў пастанову бюро калектыву, рашуча асудзіўшы выступленьне Шуляка.

Побач з гэтым, сход асабліва падкрэсьліў, што Шуляк ня прызнаў поўнасьцю памылковасьці свайго выступленьня.

Р.

Насустрач шаснаццатаму

НА МАСКОЎСКАЙ АБЛАСНОЙ

МАСКВА, 9. На ранішнім пасяджэньні, 9-га чэрвеня, Маскоўскай абласной партканфэрэнцыі быў заслуханы даклад тав. **Рыньдзіна** аб рабоце МКК. Рыньдзін паказаў, што ў асноўным работа МКК заключалася ў захаваньні адзінства радоў партыйных арганізацый, у барацьбе з правым ухілам і «левымі» загібамі. Работа МКК-РСІ праходзіла пад знакам узмацненьня ўдзелу шырокіх пралетарскіх мас ва ўсіх галінах работы КК-РСІ. **За час ад верасьня па май у абсьледаваньнях МРСІ прымала ўдзел звыш 15.000 чалавек.** У работу МРСІ удалося ўцягнуць каля 500 спэцыялістых. У бюро скаргаў МРСІ працуе звыш 400 лёгкіх кавалерыстых. Шэфства прадпрыемстваў над савецкімі ўстановамі ахапіла 153 прадпрыемствы з 215.000 рабочых, якія шэфствуюць над 135 установамі. 4.500 рабочых у парадку шэфства працуюць без аплаты ва ўстановах.

У рабоце па калектывізацыі Маскоўскай вобласьці МКК таксама, як і Маскоўскі Камітэт, падпала пад галавакружэньне. Сур'ёзная палітычная памылка дапушчана на студзеньскім пленуме МК-МКК у прыняцьці лёзунгу ліквідацыі гарадзкой буржуазіі. Пасьля паказаньня ЦК, МКК стала на шлях рашучага выпраўленьня памылак і барацьбы з перагібамі ў калгасным руху.

Вялікую работу МКК зрабіла ў барацьбе з бюракратызмам і па чыстцы сайапарату. У рэзультаце чысткі апарату МКК поўнасьцю рэарганізавала і спросьціла структуру раду абласных устаноў. Партыйная чыстка ў Маскоўскай вобласьці праходзіла пры актыўным удзеле рабочых, батрацка-бяднякіх і серадняцкіх мас.

У ходзе чысткі ў асобных установах выявіўся заціск самакрытыкі і круговая парука. Чыстка дала моцны штуршок самакрытыцы і бязьлітаснай барацьбе са скрыўленьнямі партыйнай лініі. У Маскоўскай арганізацыі выключана з партыі 14.000 чалавек, у тым ліку рабочых — 5,7 проц., сялян — 9,8 проц., служачых і іншых — 7,9 проц.

Пасьля дакладу тав. Рыньдзіна ў рашнішнім і вячэрнім пасяджэньнях адбываліся спрэчкі, у якіх прымалі ўдзел т. т. Шумяцкі, Разанаў, Лазян, і інш.

ПАД ЗНАКАМ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ

МАСКВА, 9. Па ўсім Савецкім Саюзе разгарнулася падрыхтоўка да 16-га партзьезду. На буйнейшых торфараспрацоўках у Гусяй-хрустальным (Уладзімерскай акрузе) падрыхтоўка вядзецца **пад знакам ліквідацыі вытворчага прарыву ў першым месяцы сэзону.** Пачалася сацыялістычнае спаборніцтва паміж арцелямі. Ударныя арцелі абавязуюцца перавыкаць вызначаныя пляны выпрацоўкі торфу. На Вязьнікоўскай фабрыцы ім. К. Лібкнэхта падрыхтоўка да зьезду праходзіць пад лёзунгам выплаты кожным рабочым доўгу дзяржаве да 900 руб., які склаўся ў выніку невыкананьня фабрыкай вытворчай праграмы. Рабочыя пастанавілі дабіцца да зьезду зьнішчыць фабрыкі з чорнай дошкі. На фабрыцы імя Сьвярдлова адміністрацыя абавязалася яшчэ да зьезду паставіць так вучот, каб даводзіць да ведама кожнага рабочага пяцідзённы вынікі работы фабрыкі па выкананьні прамфінпляну. Абавязацельства выканана з перавышэньнем: весткі даюцца за кожны дзень. Паводле ініцыятывы партарганізацый фабрыкі «Красный Профинтерн» ва Ўладзімерскай акрузе **пачата перакліча-мітынг па пытаньнях надыходзячага партыйнага зьезду.**

На фабрыцы «Организованный Труд» арганізаваны некалькі брыгад па праверцы работы партыйных прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый.

ТАВ. КАЛІНІН НА ТРАКТАРАБУДЗЕ

СТАЛІНГРАД, 9. Параходам з Саратава прыбыў старшыня ЦВК СССР тав. **Калінін**, які там прысутнічае на краёвай партыйнай канфэрэнцыі. На прыстані ўсесаюзнага старасту сустрэлі прадстаўнікі савецкіх і партыйных арганізацый, шматлікія дэлегацыі рабочых фабрык і заводаў і вайсковых часьцей. Тав. Калінін аглядаў трактарабуд.

Тав. Калінін прыехаў ўдзел у пасяджэньні пленуму гарсавету.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

ВАЖНЕЙШАЕ АДКРЫЦЬЦЕ

ЛЕНІНГРАД, 9. У інстытуце эксэрымэнтальнай мэдыцыны зроблена адкрыцьцё, якое адчыніе новую эру фізыялёгіі, паталёгіі і клінікі ўнутранай сэкрэцыі. Прафэсару Е. М. Лёндаду ўдалося ў сваёй лябараторыі адкрыць спосаб дасьледваньня ўнутранае сэкрэцыі падстраўнікавай вазозы і надныркавай залозы. Адкрыцьцё прафэсара Лёндана мае выдатнае значэньне. Да гэтага часу ня было магчымасьці вывучаць выдзяленьне гармонаў жывым арганізмам і да апошняга часу вывучаліся толькі самі гармоны, якія выдзяляюцца з мёртвых залоз, але не існавала зусім фізыялёгіі іх выдзяленьня. Навуковае дасягненьне прафэсара Лёндана мае гэткае-ж вялікае значэньне, як і адкрыцьцё спосабу вывучэньня зьнешняй сэкрэцыі, зробленае 40 год таму назад.

АДПУСКАЦЬ ЛЕС У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

МАСКВА, 10. Саюзны Наркамгандаль запрапанаваў сваім мясцовым органам адпускаць будаўнічы лес на пабудову хлебных сьвірнаў у першую чаргу. Для прысьпяшэньня адгрузкі лесу Хлебацэнтр пасылае на месцы сваіх упаўнаважаных.

ПАЗЫКА НАСЕНЬНЕМ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

МАСКВА, 10. Каб стварыць максымальна спрыяючыя ўмовы для поўнага выкананьня пасеўных плянаў і кантрактацыі ільну і канапель Саюзны Саўнарком дазволіў саўнаркомам саюзных рэспублік і прэзыдыумам абласных і краёвых выканкомаў выдаваць пазыку да збору новага ўраджаю насеньнем ільну і канапель індывідуальным, бядняцкім, серадняцкім гаспадаркам, якія жадаюць кантрактаваць пасевы. Ні адна гаспадарка, якая заключае дагавор на кантрактацыю ільну і канапель і якая адчувае патрэбу ў насеньні, не павінна заставацца незадаволеная. Калгасы, саўгасы, якія атрымалі насеньне ільну і канапель у якасьці пазыкі, абавязуюцца вярнуць яе пасьля збору новага ўраджаю натурай з разьліку пуд за пуд.

„Мы будзем змагацца да апошняй каплі крыві"

ІНДА-КІТАЙСКІЯ КАМУНІСТЫЯ АСУДЖАНЫ НА СЬМЕРЦЬ

Бурны размах сялянскага руху ў Індыі

«МЫ БУДЗЕМ БЯЗУПЫННА ЗАКЛІКАЦЬ ДА БАРАЦЬБЫ»

ПАРЫЖ, 9. Арыштаваны ў часе нядаўніх дэманстрацый каля палацу французкага прэзыдэнта і прыцягнуты да судовай адказнасьці член ЦК французкай кампартыі Нгуэн-Ван-Тао ўчора на допыце ў судовага сьледчага выступіў з рэзкім выкрыцьцём тэрарыстычнай палітыкі французкіх улад. «Выслаўшы ў Інда-Кітай індакітайцаў — дэманстрантаў каля палацу прэзыдэнта і сьцяны камунараў — заявіў Ван-Тао, вы асудзілі іх на кару сьмерцю. Аднак, ніякія пагрозы і рэпрэсіі не паслабяць нашай барацьбы як у Інда-Кітаі, так і ў Францыі — барацьбы, якую мы ў цесным адзінстве з французкім пралетарыятам будзем весьці да апошняй каплі крыві.

Судовыя ўлады, зусім ня маючы фактычных довадаў супроць мяне, прабуюць прышпіліць мяне да дэмутай справы, якая ўзьнікла год назад. Адзінай прычынай гэтага зьяўляецца **намер перад тварам нарастаючага рэвалюцыйнага руху ў Інда-Кітаі разграміць і паставіць па-за законам інда-кітайскіх і французкіх камуністых.** Аднак, кампартыя заяўляе, што яна ганарыцца сваёй роляю кіраўніка і арганізатара барацьбы мільёнаў французкіх калёніяльных рабоў. У той час, як сацыял-калёнізатары патрабуюць галоў інда-кітайскіх рэвалюцыянэраў, мы будзем **бязупынна заклікаць французкі пралетарыят да барацьбы за вызваленьне капёній і вызваленьне кітайскіх рэвалюцыянэраў ад пагражаючай ім расправы з боку «надзвычайных судоў».**

МАГУТНАСЬЦЬ «ЧЫРВОНЫХ РУБАШАК» РАСЬЦЕ

ЛЁНДАН, 10. Становішча на паўночна-заходняй граніцы Індыі «вельмі напружанае». Становішча ў гэтым раёне магло-б быць яшчэ горшае для брытанскіх улад, калі-б канцэнтрацыя значнага ліку брытанскіх войск не зрабіла мала сапраўднай магчымасьць выступленьняў супраціўніка ў шырокім маштабе. Сярод сялянскага насельніцтва прымежнай паласы ўзрастае моцнае нездаваленьне і абурэньне дзеяньнямі ангельцаў, якія разбурылі шмат вёсак і забілі шмат людзей у часе паветраных бамбардаваньняў. **Карэспандэнты сталічных газэт заяўляюць аб тым, што магутнасьць «чырвоных рубашак» (масавая рэвалюцыйная арганізацыя) расьце з кожным днём.**

САЦЫЯЛ-КАЛЕНІЗАТАРЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ ДА РЭПРЭСІЙ

ПАРЫЖ, 9. Французкая паліцэйская газэта «Лібэрты» перадрукоўвае апублікаванае ў танкінскай сацыялістычнай газэце «Пці Пэпюлер» афіцыйнае паведамленьне танкінскай сацыялістычнай арганізацыі, у якім, паміж іншым, гаворыцца наступнае: «... Мы кляймім ад імя ўсіх сацыялістых паводзіны партыі, якія не паддаюцца ніякай ацэнцы, якія ўносяць смуту і беспарадак у Інда-Кітаі. Як ніколі раней, зараз мы заяўляем: сацыялізм — гэта праваарадак і мір, камунізм — гэта анархія, смута і вайна. Калі правадыры вар'ятаў ня будуць безадкладна арыштаваны, уся міратворчая роля Францыі будзе засуджана на няўдачу, сацыяльная эвалюцыя ў Інда-Кітаі будзе затрымана, край будзе ўкінуты ў анархію, у жабрацтва будзе ператвораны ў руіны і ў народзе ўзмоцніцца дух гвалту і супраціўленьня. **Вінавайцы павінны быць скопленны і бязьлітасна засуджаны.** Неабходны безадкладныя энэргічныя рэпрэсіі. Усё насельніцтва, выключаючы кучкі бунтаўшчыкоў, чакае ад губернатара хуткіх і прыкладных мерапр

УДАРНЫМ ТЭМПАМ СКОНЧЫЎШЫ СЯЎБУ, РАЗГАРНУЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Посьпех уборачнай кампаніі залежыць ад: правільнай арганізацыі працы ў калгасах, своячасовага рамонту машын і рацыянальнага скарыстаньня інвэнтару

Саўгасы і калгасы павінны арганізаваць шырокую дапамогу бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам

Часу засталася мала

Сяўба ў Беларусі падыходзіць да канца. Ужо пара разгарнуць падрыхтоўку к сенаўборачнай і збожжаўборачнай кампаніі. Агульнавядома, што ад своячасовай і шваркай уборкі ўраджаю ў многім залежыць якасьць сена і збожжа. У Беларусі мы ў гэтым годзе мелі раньнюю вясну, раньнюю сяўбу. Калі надвор'е будзе спрыяць, дык у пачатку ліпеня пачнецца касьба сенажацяй, а праз месяц і ўборка хлябоў. Таму трэба ісьпяшацца з падрыхтоўкай да ўборкі—часу засталося вусім мала.

Зразумела, што асабліва добра павінен падрыхтавацца да ўборачнай кампаніі абагулены сэктар сельскае гаспадаркі, бо ён закліканы паказаць усяму сялянству прыклад добрай, выразнай работы.



Саўгас Дукора (Барысаўскі раён) на здымку пітомнік рассады

У калгасным сэктары прыдзецца сабраць з палёў вернявыя культуры (азімых і яравых) на плошчы 322 тысячы гэкт., тэхнічныя культуры — 32 тыс. гэкт., прапашныя культуры (бульба і кораньплоды) — 385 тыс. гэкт. і травы (лугавых і сеяных) — 345 тыс. гэкт. Агул калгасы ўборачнымі машынамі (снопавязалкамі, жнявяркамі) забясьпечаны. Але ўсё-ж ня хопіць некаторых больш складаных уборачных машын (якімі наша прамысловасьць яшчэ ня можа забясьпечыць калгасы ў гэтым годзе). Асабліва будзе адчувацца нястача касарак. Нястачу некаторых больш складаных уборачных машын трэба будзе папоўніць больш напружанай ручной работай, больш рацыянальна пастаўленай арганізацыяй працы.

Гаручага да трактараў, коняў і людзкой рабочай сілы ў калгасах хопіць. Для забясьпячэньня коньмі некаторых бясконных або малаконных калгасаў (месцачковых, батрацкіх) зараз закупляецца дадаткова 1.500 коняй — сродкі на гэту мэту вызначаны.

При параўнальна поўным забясьпячэньні нашых саўгасаў (за выключэньнем некаторых сьвіноводчых) уборачнымі машынамі і цягавай сілай уборка ўраджаю тут павінна прайсьці ў самы кароткі тэрмін — на працягу ня больш 2 тыдняў.

Трэба неадкладна прыступіць да складаньня плянаў уборкі ўраджаю, да арганізацыі ўборачных і малацьбітных брыгад для забясьпячэньня поўнага скарыстаньня ўборачных машын.

Трэба таксама зараз-жа прыступіць да рамонту ўборачных машын в тым, каб гэтую работу скончыць да 1-га ліпеня — аб гэтым гаворыць дырэктыва ўраду. Але цэнтральныя арганізацыі ня ведаюць, ці прыступлена да гэтай работы на мясцох і ў якой ступені апошнія забясьпечаны мэталем, абсталяваньнем і запаснымі часьцямі.

У справе забясьпячэньня запаснымі часьцямі ўборачных машын наглядаецца наступная ненармальнасьць. Месцы пасылаюць у Менск заяўкі на запасныя часьці ў грашовым выразе, без паказаньня колькасьці тых ці іншых запасных часьцей, якія ім патрэбны. І таму, нашы цэнтральныя забясьпечвачыя арганізацыі вышіваюць запасныя часткі паводле вельмі прыблізных разьлікаў, далёкіх ад уліку рэальных патрэб. У выніку адных запасных часьцей выяўляецца лішак, а другіх — не хапае. Трэба адшукаць якія-небудзь меры для вжыцьця гэтых ненармальнасьцяй

У саўгасах нястача ўласнай рабочай сілы выяўляецца, прыблізна, у разьмеры 30 проц. Трэба своячасова паклапаціцца аб падрыхтоўцы гэтай сілы, каб у часе самой уборкі ня было замінак, ня было перабояў.

Гаворачы аб надыходзячай уборачнай кампаніі нельга прайсьці міма надзвычай важнага пытаньня аб дапамозе індывідуальным бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам з боку абагуленага сэктара. Калгасы і саўгасы павінны шырока дапамагчы бядняцка - серадняцкім гаспадаркам, шляхам прадастаўленьня машын, цягавай сілы, а ў некаторых выпадках таксама і рабочай сілай.

Л. Н.

Добры пачатак

Сельска-гаспадарчая арцель «Парастак сацыялізму» (Рэчыцкі раён, Гомельскае акр.) зараз-жа, пасьля скончэньня веснавой сяўбы, распачала падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю. Парт'ячэйка калгасу мабілізавала грамадзкую думку ўсіх калгасьнікаў беднякоў і сераднякоў вакол гэтага пытаньня. Пасьля вытворчай нарады пытаньні падрыхтоўкі і плян ўборкі ўраджаю былі абгавораны на нарадзе актыву калгасу, які склікала парт'ячэйка. У абмеркаваньні актыў і радавыя калгасьнікі прынялі самы актыўны ўдзел. Нарадай было пастаноўлена арганізаваць ударныя брыгады і сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасе, набыць неабходныя ўборачныя машыны і інш.

Зараз парт'ячэйка і праўленьне калгасу прыступілі да рэалізацыі прапаноў, высунутых нарадай. На добраахвотных пачатках арганізуецца пяць ударных брыгад: жанцоў, машыністых, касцоў, возчыкаў і кладчыкаў снапоў. Прапрацавана пытаньне арганізацыі працы ў арцелі У бліжэйшыя дні яно будзе разгледжана і зацьверджана на праўленьні калгасу.

Ужо закуплены і падрыхтаваны да ўборкі ўраджаю тры жнявяркі, 4 касілкі, 2 конных грабель і інш. с.-г. уборачныя машыны.

— Нам для точкі [illegible] нажоў у машынах,— заўляе старшыня калгасу тав. Чырык,—да зарэзу патрэбны тачыльныя варштаты. У акрэкалгасаюзе сказалі, што тачыльных варштатаў няма пакуль што. «Атрымаем—дамо». А ў цэнтры ў сваю чаргу кажуць: «Атрымайце ў акрузе».

Не адзін тав. Чырык скардзіцца, што тачыльных варштатаў няма. Калгасьнікі сьцьвярджаюць, што «сяўркі мы атрымалі як сяўбу канчалі». Такая пагроза ёсьць і ў адносінах тачыльных варштатаў. Гэта адпавядае сапраўднасьці, бо пізавыя работнікі калгасаў сустракаюцца з бюракратычнымі адносінамі з боку акруговых і цэнтральных устаноў.

Ва Ўраравіцкім раёне пытаньню ўборкі ўраджаю з боку парт'ячэек раёну аддаецца вялікая ўвага. Батрацка-бядняцкія групы буйнейшых калгасаў—«Энгэльса», «Рухавік», «Камінтэрн» і інш. разам з серадняцкім актывам абгаварылі пытаньне падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і пляны ўборкі. Цяпер рамонтуюцца ўборачныя машыны, будуюцца новыя і рамонтуюцца старыя аборы для складваньня хлеба. Для гэтай мэты скарыстоўваюцца гаспадарчыя будынкі (гумны) калгасьнікаў, якія перабудоўваюцца ў вялікія хлебахавальні. Набываюцца ўборачныя машыны. У раёне таксама аддаецца ўвага мабілізацыі актыўнасьці сялянак, якія арганізуюцца ў брыгады па ўборцы ўраджаю.

Аднак, ня ўсе яшчэ партыйныя і камсамольскія арганізацыі і калгасы належным чынам разварушыліся. У большасьці калгасаў нічога ня робіцца па арганізацыі працы ў калгасах, па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. Па трэбен самы рашучы пералом. Трэба ўдарыць па абломаўшчыне і чыноўніцкіх адносінах да важнейшай кампаніі—уборкі новага ўраджаю.

САЛДАЦЕНКА.

Сяўба ў Меншчыне

Адстае выкананьне пляну па тэхнічных культурах

Паводле даных Менакрэа на 5 чэрвеня ў Менскай акрузе засеяна 396.773,2 гэкт., што складае 86,1 проц. агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 92.438,7 гэкт — 91,1 проц., індывідуальным сэктарам — 304.334,5 гэкт. — 84,7 проц.

Слаба ідзе сяўба тэхнічных культур: калгасы выканалі 40,5 проц. пляну, індывідуальны сэктар — 59,3 проц., у сярэднім — 63 проц. Па ільне плян выкананы: калгасамі на 46 проц. індыв. сэктарам — на 72,6 проц., у сярэднім — на 66,8 проц.; па канаплях: калгасамі—на 14,9 проц.; індыв. сэктарам — на 54,3 проц., у сярэднім — на 45,8 проц. Такім чынам, асабліва адстаюць з сяўбой тэхкультур калгасы.

Пад збожжавыя культуры засеяна ўсяго 221.208,7 гэкт., або 92,1 проц. пляну. Калгасамі засеяна 54.660,2 гэкт. (103.5 проц.), індывідуальным сэктарам —166.548,5 гэкт. (88,9 проц.). Па пшаніцы плян у сярэднім выкананы на 84,3 проц., ярыцы — на 152,9 проц., аўсе — на 94,1 проц., ячмені — на 93,9 проц., грэчцы — на 74,4 проц., просе — на 22,5 проц., гароху — на 85,1 проц. і іншых бабовых культурах — на 59,4 проц.

Па бульбе калгасы выканалі 85,7 проц. пляну, індывідуальны сэктар — 93,7 проц.; па кораньплодах калгасы — 31,2 проц., індыв. сэктар — 24,4 проц.; па віцы на насеньне калгасы 117 проц., індыв. сэктар — 106,7 проц.; па віцы на сена калгасы — 62,2 проц., індыв. сэктар — 64,3 проц.; па сэрадэлі калгасы—67 проц, індывідуальны сэктар — 66,5 проц.; па канюшыне калгасы — 101,9 проц., індыв. сэктар — 68,2 проц.; па лубіне калгасы — 74,8 проц., індыв. сэктар — 83,4 проц.; па гародніх культурах — калгасы — 33,2 проц., індыв. сэктар — 94,7 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы па бульбе на 92 проц., кораньплодах — на 25,9 проц., віцы на насеньне—на 108,9 проц., віцы на сена —на 63,8 проц., сэрадэлі—на 66,6 проц., канюшыне — на 75,6 проц., лубіне — на 81,5 проц., сіласных культурах — на 60,4 проц., гародніх культурах — на 81,2 проц.

Ільготы садоўніцтву і гародніцтву

У мэтах садзейнасьці разьвіцьцю садоўніцтва і гародніцтва ў калгасах і працоўных сялянскіх гаспадарках, ЦВК і СНК БССР дапоўнілі пастанову аб адзіным с.-г. падатку наступным пунктам: ПРЫБЫТАК З ПЛОШЧАЎ САДОЎ І ГАРОДАЎ ВЫЛІЧВАЕЦЦА ПА НОРМАХ ПРЫБЫТКОВАСЬЦІ ПАЛЯВЫХ ЗЯМЕЛЬ, КАЛІ САД І ГАРОД ЗАЙМАЮЦЬ НЯ БОЛЬШ 3-х ДЗЕСЯЦІН У КАЛГАСАХ І ¼ ДЗЕСЯЦІНЫ Ў СЯЛЯСКІХ ГАСПАДАРКАХ СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЬЦЯЙ І ⅛ ДЗЕСЯЦІНЫ Ў СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРКАХ ГАРАДЗКОЙ МЯЖЫ. Паказаная ільгота не датычыць гаспадарак, якія абкладаюцца ў індывідуальным парадку.

Да „Дня трактара" ня рыхтуюцца

Толькі адзін Калгасцэнтр выпрацаваў плян

«Дзень трактара» ў БССР вызначан на 20-ае чэрвеня Уся падрыхтоўка да правядзеньня гэтага дня выявілася пакуль што ў вылучэньні саюзам сельгаслесрабочых спэцыяльнага штабу кіраўніцтва. Шматлікія спробы штабу склікаць параду зацікаўленых арганізацый, якая выпрацавала-б праграму правядзеньня гэтага дня, пацярпелі няўдачу. На параду амаль ніхто не зьявіўся. Былі запрошаны прадстаўнікі Белгасцэнтру, Белсельтрэсту, Насептрэсту Ільнатрэсту ЦК ЛКСМБ і рэдакцый цэнтральных газэт. З іх прыходзілі толькі прадстаўнікі Белкалгасцэнтру і Белсельтрэсту.

Амаль усе сельска-гаспадарчыя арганізацыі паогул мала аддаюць увагі правядзеньню «Дня трактара». Так, у Белсельтрэсьце абмежаваліся толькі вылучэньнем супрацоўніка, на якога ўскладзена ўся работа, але апошні яшчэ «нічога ня ведае». Насептрэст і Ільнатрэст «пешта чулі» аб «Дні трактара». Толькі Калгасцэнтр выпрацаваў плян правядзеньня гэтага дня і запрапанаваў пізавым калгасным органам мабілізаваць калгасьнікаў на барацьбу з паломкамі трактараў, арганізаваць тэхнічную дапамогу маладым трактарыстым і г. д.

Падрыхтоўчая праца да «Дня трактара» ў калгасах пачнецца з 10-га чэрвеня.

Ва ўсіх калгасах будуць вылучаны брыгады з ліку калгасьнікаў, трактарыстых і прадстаўнікоў саветаў калгасаў, якія ў тэрмін з 12-га па 20-ае чэрвеня правядуць праверку стану трактараў і с.-г. машын, адносін да іх трактарыстых і калгасьнікаў, выявяць і падлічаць праробленую трактарамі працу ў часе веснавой пасеўнай кампаніі, выявяць прычыны прастояў і паломак трактараў. Брыгады павінны будуць выявіць лепшых трактарыстых, якія ў час веснавой пасеўнай кампаніі дасягнулі найбольшых вынікаў працы пры найменшай затраце гаручых матар'ялаў і правераць выкананьне сацдагавароў.

20-га чэрвеня ва ўсіх калгасах адбудуцца сходы калгасьнікаў, на якіх брыгады зробяць даклады аб праробленай імі працы.

А. М.

Рабочыя і калгасы—зьездам партыі.

Хто лепш і раней выканае ўзятыя на сябе абавязкі?

Праверым выкананьне абяцаньняў, даных у рапартох

5 ударных брыгад імя партзьезду

Абгаварэньне тэзісаў да XVI партыйнага зьезду на СУРАСКАЙ КАРТОННАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЯ ВАРОЎСКАГА праходзіць пры надзвычайнай актыўнасьці рабочых. На ўсіх сходах рабочыя ўхвалілі тэзісы.

ЗА 2 ДНІ АРГАНІЗАВАНА 5 УДАРНЫХ БРЫГАД ІМЯ ПАРТЫЙНЫХ ЗЬЕЗДАЎ, якія заключылі паміж сабою дагавары.

У дагаворах рабочыя абавязуюцца: [illegible]ЗАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН НА 108 проц. УЗЬНЯЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ НА 45 проц. замест 43 па прамфінпляне, зьніціць сабекошт прадукцыі на 16 проц. па прамфінпляне; давесьці брак да мінумуму.

Адначасова рабочыя патрабуюць ад адміністрацыі ХУТЧЭЙШАГА ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ТАРМАЗОЎ У РАБОЦЕ. Сартоўка папсавалася і пагражае спыненьнем работы—неабходна ў бліжэйшым часе набыць новую сетку да сартоўкі. Трэба ПУСЬЦІЦЬ ЗАПАСНУЮ 4-ю ПАПЯРОВУЮ МАШЫНУ ў мэтах павялічэньня выпрацоўкі прадукцыі; ЛІКВІДАВАЦЬ НЕНАРМАЛЬНАСЬЦІ Ў ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ФАБРЫКІ МАТАР'ЯЛАМІ.

Ударныя брыгады патрабавалі ад прафорганаў РАЗГАРНУЦЬ ШЫРОКУЮ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНУЮ І АНТЫРЭЛІГІЙНУЮ РАБОТУ.

Брыгады вырашылі здаць на хаваньне ў ашчадныя касы аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Яфрэменка, Абраменка.

Шэўхэд—стары рабочы, вытворчы стаж 26 год, ударнік, падаў заяву аб уступленьні ў рады КП(б)Б.

Падарунак 16 партзьезду

Па ўсіх цэхах Віцебскага заводу «Чырвоны Мэталісты» прыступлена да абгаварэньня тэзісаў тав. Куйбышава.

15 чэрвеня адбудзецца агульны сход «[illegible]000», вылучанах заводам, на якім будзе заслухана інфармацыя аб ходзе падрыхтоўкі да 16 партзьезду ўпадшэфным раёне. У падшэфны Сеньненскі раён паслана два чалавекі для падрыхтоўкі калгасаў да 16 зьезду і папулярызацыі тэзісаў тав. Якаўлева.

За апошнія некалькі дзён падана ў партыю 28 заяў. Большасьць паступаючых—кваліфікаваныя рабочыя, добрыя актывісты.

Брыгада па вырабе штампаў мэханічнага цэху ў ліку 8 чалавек бярэцца ў парадку ўдарніцтва шпаркім тэмпам вырабіць штампы новай канструкцыі для прэсаў да плугоў № 14. Гэтыя штампы будуць паднесены ў якасьці падарунку 16 партзьезду. Плужны цэх заводу даў за май месяц 10 проц. звыш вытворчай праграмы.

Дрэнна рыхтуюцца да зьезду камсамольская арганізацыя і рэдкалегія газэты. Дагэтуль ня выпушчана пяхіх лістовак, прысьвечаных падыходзячаму зьезду партыі.

Г. Каган.

МАЙСКІ ПРАРЫЎ ЛІКВІДУЕЦЦА

БАБРУЙСК. (Наш брыгадзір). Прасавальны агрэгат шэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага ў колькасьці 18 рабочых абвясьціў сябе ударнай брыгадай на асновах калектыўнай зьдзельшчыны. Брыгада ўзяла на сябе абавязак выканаць прамфінплян і яго якасныя паказальнікі, забясьпечыць якасьць выпускаемай продукцыі, быць прыкладам для іншых рабочых.

Зараз мы МАЕМ ЗНАЧНЫ ПЕРАЛОМ [illegible] У ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ. Майскі прарыў на фабрыцы паступова ліквідуецца.

25 рабочых фабрыкі падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Брыгадзір «Зьвязды» РАЙХЛІН.

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯН СЯЎБЫ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Саўгас «Адамені-Станіславава», Лёзьнянскага раёну, у рапарце XIII зьезду КП(б)Б паведамляе, што ПЛЯН ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ІМ ВЫКАНАН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ НА 20% ВА ЎДАРНЫМ ПАРАДКУ ДА 24-га МАЯ.

Зараз саўгас ўзяў ільнаводчы напрамак — пад лён засеена 106 гэкт.

Саўгас аказвае вялікую дапамогу на[illegible] жывёлай нанава сеньнем і [illegible] Лунец, Аляксееў, Калаў, Каўцэвіцкая, [illegible] арганізаваным калгасам. У [illegible] шэфства рабочыя прапрацавалі ў 6 калгасах 192 рабочыя дні. Рабочыя саўгасу вылучылі ўдарную брыгаду з трох чалавек для пастаяннай работы ў калгасе «Беларуская Вёска».

РАНЕЙ ВЫЗНАЧАНАГА ТЭРМІНУ

БАБРУЙСК. (Наш брыгадзір). Члены калгасу «Расьсьвет» паслалі рапарт 13 зьезду КП(б)Б. У рапарце калгасьнікі паведамляюць, што сяўба скончана на 4 дні раней вызначанага плянам тэрміну. Пасеўная плошча пашырана на 15 проц. звыш пляну. Зараз калгасьнікі асушылі 40 гэкт. балота, дзе ніколі ня стулала чалавечая нага. На гэтым балоце мяркуецца засеяць 18 гэкт. вікі для сіласных кармоў.

Створаны ўдарныя брыгады па ўборцы ўраджаю, у ліку 173 чалавек.

У калгасе арганізаваны ясьлі на 75 дзяцей і дзіцячая пляцоўка на 50 дзяцей.

ПАПРАЎКА

Пад нарысам «Гарадок навукі» («Зьвязда» № 134) пры вёрстцы выпаў подпіс «Міх. Кін».



Горкі—стары рабочы, вытворчы стаж 21 год, нядаўна ўступіў у рады партыі.

Самаправерка на абутковых фабрыках змазана

Май ня даў паляпшэньня у выкананьні прамфінпляну

ЦП саюзу гарбароў лічыць паўторную самаправерку непатрэбнай

Самаправерка сацдагавароў па саюзе гарбароў ужо скончана. Але з вывадаў відаць, што мала ўдзелена ўвагі самаправерцы з боку прафсаюзу.

У вывадах перавышаюць агульныя ацэнкі і характарыстыкі: накшталт «ёсьць у нас некаторыя дасягненьні, але ёсьць і недахопы». Вось лейтматыў большасьці вывадаў самаправерачных брыгад. Адразу відаць, што па лежнага кіраўніцтва брыгадамі з боку заводзкіх арганізацый ня было.

На некаторых прадпрыемствах самаправерка была фактычна змазана. Напрыклад, па віцебскай абутковай фабрыцы імя Лекерта, паводле паведамленьня старшыні фабкому т. Угорэца, самаправерка быццам пачалася з 1 красавіка. Фактычна самаправерка пачалася з 3 мая і была скончана 15 мая. Зразумела, што такія «тэмпы» самаправеркі нічога рэальнага не далі. Ніякіх паляпшэньняў у справе выкананьня дырэктывы аб адзінаначальлі, большай увязкі паміж цэхамі і зьнішчэньня недахопаў—самаправерка не дала. У штампавальным цэху гэтымі днямі знайшлі 100 рабочых, якія спакойна ў часе работы, седзячы па сталох, адпачывалі. Чым-жа быў выкліканы прастой? А тым, што майстар Шчоўкалін не дагаварыўся са складам аб дастаўцы адпаведных матар'ялаў.

Дырэктар фабрыкі Розэнблюм не зварачае ніякае ўвагі на расхлябанасьць, якая існуе паміж майстрамі і г. д. Самаправерка не завастрыла пытаньняў палапшэньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Таму няма нічога дзіўнага, што, калі за паўгодзьдзе вытворчая праграма была выканана па 87,9 проц., дык у красавіку праграма была выкана ўсяго на 86 проц.

Пасьля самаправеркі, з 15 мая па 1 чэрвеня, фабрыка імя Лекерта не працавала, рабочыя найшлі ў адпачынак. І, здаецца, што за гэты час пават тое, што дала самаправерка, зьнікла. За першыя тры дні пасьля адпачынку фабрыка здала складу Скурсындыкату 6.000 пар абутку, з якіх толькі 1.500 былі аднесены, як першагатунковыя, а іншыя ў другі і трэці гатунак. Усяго-ж за тры дні фабрыка выканала праграму толькі на 60 проц. Гэта даволі выразна кажа аб якасьці самаправеркі.

Ня лепш справа стаіць і на менскай абутковай фабрыцы. У пачатку самаправеркі справа трохі палепшылася. Калі за першае паўгодзьдзе вытворчая праграма была выканана ў сярэднім на 91,1 проц., дык у красавіку праграма была выканана на 99,2 проц. Здавалася,б, што фабрыка—на шляху да канчатковай перамогі. Але пасьля самаправеркі, г. зн. у маі, праграма выканана ўсяго на 94 проц. Ці можна тут згадзіцца, што самаправерка зрабіла патрэбны пералом у выкананьні прамфінпляну?

На гомельскай абутковай фабрыцы —той-жа малюнак. У сакавіку вытворчая праграма была выканана на 85 процантаў, у красавіку — на 50 проц., а ў маі, паводле паведамленьняў пашага рабкора, ніякіх паляпшэньняў у рабоце фабрыкі няма.

Тое, што на абутковых фабрыках самаправерка не дала належнага пералому ў выкананьні прамфінпляну—пікога з работнікаў цэнтральнага праўленьня саюзу ня цікавіць. На пытаньне да старшыні ЦП саюзу—ці думае ён правесьці паўторную самаправерку, паводле дырэктывы ЦК УсеКП(б), старшыня адказаў:

— Прыдзецца, мусіць, у часе перавыбараў фабзаўкомаў завастрыць увагу аб невыстарчальнай праверцы выкананьня сацдагавароў, а зноў пачынаць самаправерку няварта...

А. Манькоў.

Прапановы рабочых не павінны застацца на паперы

Самаправерка выкананьня прамфінпляну і сацспаборніцтва на большасьці прадпрыемстваў прайшла большменш здавальняюча. Былі, зразумела, выпадкі, калі самаправерка была праведзена бяз усякіх канкрэтных вынікаў, калі ніякіх паляпшэньняў у выкананьні прамфінпляну і кіраўніцтве сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам самаправерка ня ўносіла. Аб гэтых фактах «Зьвязда» ў свой час паведамляла.

Але мы паўтараем, на большасьці прадпрыемстваў мы маем зусім рэальныя станоўчыя вынікі самаправеркі. Вось прыклады.

На Бабруйскім камбінаце самаправерка дала штуршок далейшаму разгортваньню вытворчай актыўнасьці рабочых. За час самаправеркі падана каля 50 заяў аб жаданьні ўступіць у партыю. Арганізаваны тры новыя ўдарныя брыгады. Узмацнілася кіраўніцтва сацспаборніцтвам з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Ёсьць пералом і ў выкананьні прамфінпляну.

На заводзе імя Домбаля ў часе самаправеркі быў зроблен значны пералом як у настроях рабочых, так і [illegible] заводу. Вельмі многа было [illegible] для азнаямленьня рабочых з прамфінплянам і для давядзеньня яго да кожнага варштату і рабочага.

На Мазырскай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» актыўнасьць у часе самаправеркі была такая вялікая, што многія рабочыя на першым-жа сходзе запісаліся ва ўдарныя брыгады. Зараз 54 проц. рабочых фабрыкі зьяўляюцца ўдарнікамі.

На цьвіковым заводзе «Чырвоны Кастрычнік» (Аршанская акруга) у часе самаправеркі арганізаваны чатыры новыя ўдарныя брыгады з агульнай колькасьцю 37 чалавек.

На швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» у Віцебску, на якой занята звыш 2 з пал. тысячы чалавек, самаправерка зрабіла значны пералом у выкананьні прамфінпляну. Так, у красавіку фабрыка выканала вытворчую праграму на 99,7 проц., а за другую палову мая—на 104 проц.

Можна падаць яшчэ дзесяткі прыкладаў, калі самаправерка разварушыла рабочых узмацніла іх увагу да выкананьня прамфінпляну, дала новы штуршок разгортваньню сацспа[illegible]ку. У гэтым [illegible]веркі.

Разам з гэтым самаправерка выявіла вельмі шмат вытворчых недахопаў. Амаль па ўсіх прадпрыемствах у вывадах праверачных брыгад можна знайсьці дзесяткі паказаньняў на тыя ці іншыя вытворчыя недахопы і дзесятні прапаноў, што і як палепшыць у кіраўніцтве прадпрыемствам і яго рабоце.

Гэтыя прапановы не павінны застацца толькі на паперы. Гаспадарнікі ў першую чаргу павінны заняцца вывучэньнем гэтых прапаноў і іх ажыцьцяўленьнем. Прафработнікі павінны рганізавць пастаянны кантроль над выкананьнем гэтых прапаноў, разам з гаспадарнікамі вызначыць пэўныя тэрміны іх выкананьня і сыстэматычна інфармаваць рабочых аб гэтай справе.

Самаправерка не праводзілася для «гісторыі», як гэта зразумелі па некаторых прадпрыемствах. Самаправерка павінна была даць рэальныя рэзультаты і гэтых рэзультатаў трэба дабівацца і пасьля самаправеркі па падставе вывадаў самаправерачных брыгад. Аб выніках самаправеркі будуць сьведчыць толькі лічбы выкананьня прамфінпляну.

П.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ШУКАЮЦЬ РАБОЧЫХ, А КВАЛІФІКАВАНАЙ РАБОЧАЙ СІЛЫ НЯМА

Падрыхтоўка кадраў не пасьпявае за тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва

Савецкая Беларусь—хутка індустрыялізуецца.

На балотах будуюцца электрычныя станцыі. Расьце прамысловасьць гарадоў.

Яшчэ два гады назад мы маглі толькі марыць аб тым, што поўсаматужны заводзік «Энэргія», на якім толькі 7 го назад працавала 50 чалавек, праглыне 1.500 рабочых; што завод «Камунар», на якім толькі два гады назад было занята каля 120 рабочых, стане машынабудаўнічым заводам з 800 рабочымі.

***

У той час, як у капіталістычных краінах беспрацоўе расьце з кожным днём, з прадпрыемстваў выкідваюцца тысячы кваліфікаваных рабочых, асуджаных на галоднае існаваньне,—у СССР, дзякуючы індустрыялізацыі краіны, беспрацоўе зьмяншаецца з кожным годам.

Лічбы гавораць аб тым, што ў Савецкай Беларусі—аднэй з адсталых краін—за кароткі час беспрацоўе значна скарацілася, ня гледзячы на тое, што ў горад з кожным днём уліваюцца новыя кадры вясковай беднаты, якія ўпяршыню шукаюць паёмнай працы.

У студзені г. г. на біржах працы БССР налічвалася звыш 30.000 беспрацоўных. На 1-га красавіка лік беспрацоўных зьменшыўся на 20 проц.

На 1-га мая мы маем новае зьніжэньне ліку беспрацоўных на 20 проц. —да 19.000 чал. З якіх катэгорый складаюцца кадры беспрацоўных? Пераважная большасьць—хатнія работніцы (звыш 9.000 чал.) і асобы, якія ўпяршыню шукаюць работы (6.682).

Кваліфікаваных рабочых на біржы працы амаль няма. Большасьць зарэгістраваных кваліфікаваных рабочых —лятуны, якія вандруюць з аднаго прадпрыемства на другое ў пошуках больш высокіх ставак і лепшых умоў работы.

Такі-ж малюнак на Менскай біржы працы. На 1-га студзеня на біржы налічвалася 7.547 беспрацоўных. на 1 мая—5.374, з іх 1.819 асоб упяршыню шукаюць работы.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што за апошні час мы стаім перад праблемай не беспрацоўя, а «безработніцтва». Не хапае рабочай сілы, каб задаволіць попыт нашай прамысловасьці.

Што робяць нашы органы працы, каб падрыхтаваць рабочую сілу, каб перакваліфікаваць тых беспрацоўных, якія лічацца на біржы

Рэдакцыя зацікавілася гэтым пытаньнем. Выявілася, што нашы прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі мала цікавяцца забясьпячэньнем рабсілай нашай прамысловасьці. Органы працы зусім ня ведаюць, колькі рабочых патрэбна ў бліжэйшы час нашым фабрыкам і заводам. Вось выразны прыклад. У сакавіку Наркамцрацы запытаў у Белмэталяаб'яднаньня—колькі патрабуецца ім рабочай сілы на бліжэйшы час, гэтыя весткі патрэбны ў мэтах падрыхтоўкі рабочых-мэталістых. Дырэктар аб'яднаньня т. Фіш адказаў: «Патрабуецца ня больш 50 чалавек. Я думаю, што яны на біржы знойдуцца».

Тэмпы індустрыялізацыі значна апярэдзілі разважаньні дырэктара. Гэтымі днямі з мэталяаб'яднаньня прышло паведамленьне «Мэталяпрамысловасьці БССР да 1 кастрычніка трэба новых 5.000 рабочых. Зараз на «Сельмаш» трэба паслаць 900 чалавек, на завод імя Ланцуцкага—900 чалавек, на завод «Энэргія» і «Камунар»—па 450 чал.» Дзе ўзяць такую колькасьць рабочых, калі на біржы няма падрыхтаванай рабочай сілы?

Біржы працы ня маюць вестак аб тым, колькі рабочых патрэбна прамысловасьці БССР і таму ня маюць пляну падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Органы працы працуюць усьляпую—адкрываюць курсы, часта зусім непатрэбныя, перакваліфікоўваюць рабочых недэфіцытных спэцыяльнасьцяй у той час, як на некаторыя катэгорыі адчуваецца сапраўдны голад.

На пытаньне нашага супрацоўніка, колькі рабочых трэба падрыхтаваць у бліжэйшы тэрмін, загадчык рынку працы НКП т. Конькінаў адказаў:

«Мы толькі ведаем, што для фабрыкі цукерак да сьнежня трэба падрыхтаваць 600 жанчын і 100 мужчын; заявак больш няма».

Цэнтральны Інстытут Працы падрыхтоўвае шмат тынкоўшчыкаў і каменшчыкаў. Іх палічваецца на менскай біржы каля 250 чалавек; а токараў і сьлесараў не хапае.

Падрыхтоўка кадраў—«вузкае месца» работы органаў працы. Не дарэмна загадчык рынку працы т. Конькінаў упарта адмаўляўся даць весткі нашаму супрацоўніку аб падрыхтоўцы кадраў і патрабаваў напісаны артыкул наперад узгадніць з ім.

Хутка ўзрастаючая прамысловасьць павінна быць забясьпечана рабочай сілай. Падрыхтоўка кадраў павінна пасьпяваць за тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва.

А. Манькоў.

Улік аб'ектаў абкладаньня—на-за ўвагай савецкай грамадзкасьці

У БССР праводзіцца зараз улік аб'ектаў абкладаньня с.-г. падаткам. Справа гэта вельмі важная і адказная, бо ўлік павінен даць адказ на рад запытаньняў вялікага эканамічнага і палітычнага значэньня.

Улік павінен выявіць сапраўдныя крыніцы прыбыткаў асобных гаспадарак у мэтах правільнага разьмеркаваньня падатку паміж асобнымі сацыяльнымі групамі.

Улік павінен даць выразны малюнак эканамічнага твару абагуленай часткі на шай вёскі і ў першую чаргу калгасаў.

Улік павінен падагуліць эканамічнае становішча неабагуленай часткі гаспадаркі калгасьнікаў.

Улік павінен выявіць эканамічнае становішча індывідуальнага сэктару сельскае гаспадаркі.

Па матар'ялах уліку будзе налічан с.-г. падатак. Па гэтых матар'ялах будзе налічана страхоўка. Матар'ялы ўліку паслужаць базай для далейшай распрацоўкі мерапрыемстваў па сацыялістычным будаўніцтве сельскай гаспадаркі

Ніколі ўлік ня ведаў такіх адказных задач. Між тым на улік ніякай увагі не зварачаецца на мясцох. Партыныя і савецкія арганізацыі ў раёне ўзвалілі ўсю работу на плечы загадчыкаў фінчастак і чакаюць, што гэтыя загадчыкі самі выканаюць такую вялікую справу, як улік аб'ектаў гэтага году.

Карткі ўліку ў гэтым годзе значна больш складаныя, чым у мінулым. Аб іх складанасьці многа гавораць, але ніхто не паклапоціцца аб тым, каб рэальна дапамагчы тым тысячам працаўнікоў, якія будуць заняты запаўненьнем гэтых картак.

Вось прыклады таго, што па мясцох нядаацэньваюць значэньня ўліку. На Віцебскай акруговай нарадзе, дзе абмяркоўваліся галоўныя пытаньні ўліку, кіраўнік фінансавымі справамі акругі тав. Сапрыцкі прысутнічаў толькі некалькі мінут.

Старшыня Лупалаўскага РВК, Магілеўскае акругі, палец аб палец ня ўдарыў, каб арушыць улік з мёртвага пункту. У Хацкевіцкім сельсавеце гэтага-ж раёну ўлік праведзен кавалерыйскім наскокам у тры дні ў той час, як на гэту справу трэба даць 40-50 дзён. У Сухараўскім сельсавеце ўлікам займаецца адзін старшыня, які ўлічвае 100 гаспадарак у адзін дзень. У Фашчеўскім сельсавеце, Шклоўскага раёну, незямларобчыя заработкі ўлічваюцца ў канцылярыі сельсавету. Аб ільготах па агра- і зоамінімуме ня

МЕНСК

МЕСЯЧНІК ЗБОРУ І ВЫВАЗКІ КАМЕНЬНЯ І ПЯСКУ

Для выканаьня пляну дарожнага будаўніцтва ў БССР на 1929-30 г. загатоўлена толькі 48 проц. каменьня, а вывезна да месца работ 24 проц. агульнай патрэбы. Дрэнна наладжана забесьпячэньне будаўніцтва пяском.

ЦВК і СНК БССР у сувязі з гэтым абвясьцілі месячнік па зборы і вывазцы каменьня і пяску для дарожнага будаўніцтва. Месячнік праводзіцца ў парадку самаабавязанасьці вёсак і калгасаў з аплатай гэтых работ паводле існуючых расцэнак. Месячнік уводзіцца ў раёнах Віцебскай, Аршанскай, Менскай, Бабруйскай, Гомельскай і Полацкай округ.

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ПА БАРАЦЬБЕ СА СТРАТАМІ

Прэзыдыум ЦСПСБ і ВСНГБ зьвярнуліся да ўсіх прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый з прапановай разгарнуць работу па ўцягненьні шырокіх мас рабочых у барацьбу са стратамі. Для барацьбы са стратамі на прадпрыемствах будуць арганізаваны спэцыяльныя ўдарныя брыгады. Уся работа павінна праводзіцца ў цеснай сувязі з бюро рацыяналізацыі Арганізуюцца ячэйкі садзейнасьці барацьбе са стратамі.

ЭКСКУРСІЯ Ў ЯЎРЭЙСКІЯ КАЛЕННІ КРЫМУ І УКРАІНЫ

Праведзеная ў мінулым годзе экскурсія рабочых і служачых у яўрэйскія вямляробчыя калёніі дала добрыя вынікі ў сэнсе азнаямленьня рабочых з пытаньнем зямляўпарадкаваньня яўрэйскіх бядняцкіх мас, а таксама і інтэрнацыянальнага выхаваньня.

ЦСПСБ разам з Белазетам сёлета таксама арганізуе агульную міжсаюзную экскурсію ў яўрэйскія зямляробчыя калёніі Крыму і Украіны. Ад'езд экскурсантаў назначан на 15-га чэрвеня. Экскурсанты будуць вылучацца на прадпрыемствах.

КУРСЫ КІРАЎНІКОЎ САЎГАСАЎ

Пры Беларускай с.-г. акадэміі адбыўся выпуск 3-хмесячных курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў саўгасаў. Курсы скончыла 49 чалавек. Сярод іх 27 рабочых, 5 батракоў. [illegible] проц.».

[illegible] робіць вывад, што «вопрос о добровольности отходит в сторону».

Гэты мануўр паш[illegible]

СТАНОВІШЧА ПАСЕВУ БССР

1-га чэрвеня не зьяўляецца паказальным для таго, каб рабіць прагнозы ўраджаю хлябоў.

Усё-ж, разглядаючы мэтэаралёгічныя ўмовы другой паловы мая і балавыя ацэнкі пасеваў раённых і акруговых экспэртных камісій, экспэртны савет Дзяржплану БССР прыняў наступную ацэнку становішча пасеваў на 1-га чэрвеня г.г.:

азімыя характарызуюцца ацэнкай у 113 пунктах — 3,5 бала;

яравыя пасевы, сеяныя травы і сенажаці характарызуюцца балам крыху вышэй сярэдняга.

У прэзыдыуме ЦВК БССР

Назначэньні

— Намесьнік Старшыні Цэнтральнай Камісіі па паляпшаньні працы і быту жанчын пры Прэзыдыуме ЦВК БССР тав. **Бурава** вылучана ад БССР у склад Камітэту пры Прэзыдыуме ЦВК Саюзу ССР па паляпшаньні працы і быту работніц і сялянак.

— Т. т. **Бялуга** і **Божык** назначаны намесьнікамі Народнага Камісара Асьветы БССР.

Тав. **Сілаў** назначаны намесьнікам начальніка Галоўнай Управы шосавых і грунтовых дарог і аўтамабільнага транспарту БССР.

Т. т. **Луцкевіч**, Е. В. і **Гарцман**, Д. М. назначаны Членамі Вярхоўнага Суду БССР.

ЖЫВЕ КЛЕЙНБОРТ!

1.

Задачы марксыцкай крытыкі заключаецца ў тым, каб у разборы нашай літаратуры і асабліва яе выдатнейшых прадстаўнікоў—выяўляць у сьвятле марксыцкага падыходу ўсё разьвіцьцё літаратурнай творчасьці, яго сацыяльны зьмест, яго клясавую падаплёку, браць гэту творчасьць у сувязі з усім ходам і разьвіцьцём клясавай барацьбы.

З прычыны слабасьці нашых кадраў на літаратурным фронце, а часамі і з прычыны нашага няўменьня завастраць увагу па **галоўным** з многага, невыстарчальнасьці, я-б сказаў, чуйнасьці і пільнасьці да ўсяго, што выкідаецца на кніжны рынак — часта прадстаўніцтва ілжэ-марксыцкай літаратурнай крытыкі бярэ на сябе наш вораг. Больш таго, і яшчэ горш (у гэтым ужо наша простая віна!), калі гэты вораг прабуе на пэўных участках літаратурнага фронту і літаратурнай крытыкі браць на сябе ў некаторай ступені манаполію на «марксыцкую» крытыку, на духоўнае бацькаўства гэтай крытыкі.

На адным такім факце, на такім «манапалістым» крытыкі мы і хочам спыніцца ў гэтым артыкуле. Гутарка ідзе пра вядомага прафэсара Клейнборта, вялікая кніга якога «Молодая Белоруссь» была ў свой час жорстка і правільна раскрытыкавана нашым партыйным друкам. Але Клейнборт не абмежаваўся сваёй «Молодой Белоруссью» і працягвае сваю шкодную і варожую нам справу. За апошні час ён абраў у пытаньнях беларускай літаратуры сваёй «спэцыяльнасьцю» выступаць з крытычнымі прадмовамі да расійскіх перакладных выданьняў твораў беларускай літаратуры. На гэтай арэне ён свабодна гуляе са сваімі антымарксыцкімі буржуазна-нацыяналіскімі поглядамі і тэорыямі.

Клейнборт — мэцэнацтвуючы прафэсар, буржуазны лібэрал, які ў сваіх поглядах і тэорыях часта злучае вялікадзяржаўны расійскі шавінізм з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У факце гэтага злучэньня расійскіх шавіністычных і беларускіх нацыянал-дэмакратычных канцэпцый няма нічога дзіўнага. Прычыны гэтага ясны — агульныя сацыяльна-клясавыя карэньні. І калі падыходзіць да ацэнкі гістарычных зьявішч, калі прабуюць даць аналіз літаратурнай творчасьці на фоне ўсяго сплёту клясавых узаемаадносін, то і ў расійскаму «левых», разумеючы пад словам «увлекшиеся» партыйныя арганізацыі, усю партыйную [illegible]

Усе [illegible] буржуазнага прафэсара, і ў беларускага нацыянал-дэмакрата знаходзіцца агульны тон, агульная мова, агульныя тэорыі. Такое «арыгінальнае» спалучэньне вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму і беларускага нацыянал-шавінізму мы і назіраем у прафэсара Клейнборта.

Прадметам нашага разгляду зьяўляецца прадмова, напісаная Клейнбортам да «Сборника стихов» Янкі Купалы, выданага Дзяржвыдавецтвам СССР **у 1930 годзе**. Мы тут ня стаўім сваёй задачай гаварыць аб творчасьці самога Янкі Купалы. Мы ставім сваёй мэтай паказаць, як Клейнборт у гэтай прадмове працягвае ў сваёвым выданьні буржуазна-нацыяналіскія погляды, якія на сваёй сутнасьці зьяўляюцца пераневам вядомых песень нацыянал-дэмакратызму. Важнае заключаецца ў тым, што гэтыя песьні пяюцца ў 1930 годзе з трыбуны савецкіх выданьняў, важнае заключаецца ў тым, што гэтыя погляды ня трацяць сваёй **актуальнасьці**, бо яны зьяўляюцца ідэалёгічнай зброяй у руках клясавага ворага, які змагаецца супроць нас усімі сіламі і ўсімі сродкамі.

II.

Прадмова Клейнборта, у якой ён з безапэляцыйным тонам высока аўтарытэтнага чалавека дае крытычны аналіз творчасьці Янкі Купалы, пачынаецца, як заўсёды, з гісторыі. Гэты прадмет асабліва ўлюбёны буржуазнымі прафэсарамі, бо тут яны пад відам нявінных «навуковых практыкаваньняў» па пытаньнях мінулага, будуюць свае погляды дзеля таго, каб такім чынам, гаварыць аб сучасным. Для адводу вачэй разбаўленая вадзічкай «марксыцка»-«рэвалюцыйнай» тэрміналёгіі, прадмова Клейнборта на працягу 30 старонак разгортвае ўсю стройную сістэму нацыянал-дэмакратычных тэорый.

У 1930 годзе на старонках савецкага выданьня Клейнборт працягвае прапаведаць **бясклясавасьць беларускага народу**. «У беларускім народзе няма клясаў; суцэльнае мужыцкае плято — вось клейнбортаўскія мудрасьці, якія знаходзяць сваё месца ў прадмове. Клейнборт піша:

«Польскія-ж аграры прадстаўлялі ў Беларусі зямляўладаньне, расійскае чыноўніцтва — царызм, яўрэі-гандляры — дробную і сярэднюю буржуазію; беларусы-ж галойным чынам — бядняцка-сераднякоую масу сялянства»...

Усё па-старому, па нацыянал-дэмакратычнаму штампу — беларус гэта бядняк, паляк — гэта памешчык, рускі — гэта чыноўнік, яўрэй — гэта гандляр. Беларускага кулацтва, таксама, як беларускага, яўрэйскага, рускага і польскага рабочага нап прафэсар ня бачыць, бо ўся пабудова яго тэорыі грунтуецца на бясклясавасьці беларускага народу. Цьверджаньні аб бясклясавасьці беларускага народу цесна зьвязваецца з другой нацыянал-дэмакратычнай мудрасьцю. Гаворачы аб пашаніўскім руху, Клейнборт піша:

«У аснове яго (руху) ляжала зьлітнасьць нацыянальнага і сацыяльнага момантаў».

Гэта зьлітнасьць разумеецца Клейнбортам, як адзіны беларускі народ — з аднаго боку, і палякі, рускія і яўрэі — чыноўнікі, памешчыкі, гандляры — з другога.

У чым небясьпека, і я-бы сказаў, **актуальная небясьпека** гэтых тэорый цяпер, у перажываны намі пэрыяд? Апрача таго, што гэтыя погляды і нацыянал-дэмакратычныя тэорыі прабуюць усю гісторыю Беларусі ставіць на свае нацыянал-дэмакратычныя рэйкі, апрача таго, настойлівае прапаведваньне, няхай нават толькі ў гістарычным аспэкце, бясклясавасьці беларускага народу ставіць сваёй мэтай разбраеньне пралетарыяту і бядняцка-сераднякоых мас сялянства, якія ў сучасны момант вядуць жорсткую клясавую барацьбу супроць капіталістычных элемэнтаў горада і вёскі. У той час, калі рабочая кляса і кіруемыя праз яе асноўныя масы сялянства вядуць разгорнутае сацыялістычнае наступленьне і ламаюць супраціўленьне клясавага ворага, — чуваць [illegible] най векавымі нягодамі», нацыянальнай псыхіцы, культуры, нярэдка затушоўвалі тыя няясьнасьці, якія за гэтымі паняцьцямі хаваюцца... Адпак, гэта быў нацыяналізм чыста абарончы, нацыяналізм прыгнечанай народнасьці. Здаровае зерня руху заключалася імення ў тым, што яно было дэмакратычна, ішло пад знакам працоўных мас»...

Такім чынам, у пашаніўскім пэрыядзе так званага «адраджанізму» Клейнборт бачыць толькі буржуазна-дэмакратычны зьмест. Ён робіць «Нашу Ніву» прадстаўніком беларускіх працоўных мас, манапалістым і прадстаўніком іх нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Ідэалізацыя буржуазна-нацыяналіскай «Нашай Нівы» падаецца ў даным выпадку пад соусам некалькіх фраз аб «затушоўваньні няясьнасьцяй», якія, моў, былі захаваны за «пашаніўскімі паняцьцямі». Але тым больш шкодны і небясьпечны гэтыя погляды. Спробы падаць нацыянал-дэмакратычныя тэорыі толькі ў завуаляванай форме павінны быць здэмаскаваны з усёй рашучасьцю. Манэўр ворага павінен быць выкрыт да канца.

Клейнборт у сваіх гістарычных разважаньнях надыходзіць і да ацэнкі 1905 году на Беларусі. І тут, той-жа самаўпэўнены тон прафэсара, які, відавочна, разьлічвае на тое, што яго нацыянал-дэмакратычныя погляды, да рэчы кажучы, прыпраўленыя не малой дозай эклектычнай балбатні, будуць успрыйматцца, як вышэйшая і бясспрэчная мудрасьць. Вось якія пэрлы прафэсарскай мудрасьці мы знаходзім у ацэнцы 1905 году на Беларусі:

«Зразумела, 1905 год ня менш даў сябе адчуць у Беларусі, чым у іншай Расіі. Унутраное аблічча вёскі зьмянілася ў бок новых жыватворчых імкненьняў. У разумовы абіход селяніна ўвайшлі гарадзкія ідэі. Аднак, працэс гэты далёка ў глыбіню не пайшоў. Рэзка выказанай работы сьвядомасьці не чакайце ў беларускай вёсцы. Проста прачнулася патрэбнасьць усьвядоміць сваё я, сваё чалавечае я, якое ў краіне, разадзіранай грызьнёй, спрадвечна [illegible]

—партыі бальшавікоў. Клейнборт, вядома, ні адзіным словам не гаворыць аб яўных арыентацыях беларускіх нацыянал-нацыяналістычных партый на нямецкіх імпэрыялістых і на іх перамогу (вядомыя тэлеграмы Вільгельму II). Або гэта было таксама «паражэнствам»? Беларускія буржуазна-нацыяналістычныя партыі былі паражэнцамі, але паражэнцамі ў адносінах да Кастрычніцкай рэвалюцыі, да грамадзянскай вайны, якую вёў перамогны пралетарыят і рэвалюцыйнае сялянства пад кіраўніцтвам бальшавікоў, да ўзброенай абароны завяваньняў Кастрычніка. Але гэтае паражэнства іх ставіла на той бок барыкад у барацьбе за савецкую ўладу, за Савецкую Беларусь. І яўна нацыянал-дэмакратычныя зьяўляюцца спробы пусьціць у ход новыя тэорыі, якія ідэалізуюць контр-рэвалюцыйны буржуазны нацыяналізм і яго ролі ў часе вайны.

Але ўжо зусім надзейна гучаць словы клейнбортаўскай прадмовы аб тым, чые ідэалы ажыцьцёўлены стварэньнем БССР. Хаваючыся за сьціну народнага паэты, Клейнборт правалакае адкрыта лупкевічаўскія погляды. Вось што ён піша:

«Вершы, якія ўвайшлі ў апошні яго збор, лічбова, праўда, скупыя, гаворыць аб тым, што паводле думкі паэты, савецкая ўлада ажыцьцявіла для Беларусі тое, аб чым пісьменнікі асноўнай плыні марылі з першых крокаў сваёй дзейнасьці, што маніфэст, надпісаны Жылуновічам, першым старшынёй Беларускага Саўнаркому, злучыў момант нацыянальны з момантам сацыяльным да чаго яны і імкнуліся».

Хто гэта—«яны»? Аб кім ідзе тут гутарка? Гутарка ідзе аб пакаленьні «нашаніўцаў», аб іх «ідэалах». Гутарка ідзе аб буржуазным нацыяналізьме і яго «надзеях» і плянах. Да дазволіць мне «паважаны» прафэсар, калі я падам адно месца з брашуры Луцкевіча «За дваццаць пяць гадоў». Вось што гаворыць ідэолёг беларускага нацыянал-фашызму на гэту тэму:

«І толькі ў 1903 годзе паўстае першая, зусім самастойная беларуская [illegible] арганізацыя — «Беларуская [illegible]

[illegible] правы. І вось Дудар наступае на якіясьці калючкі, якія раняць увесь строй яог гераічнага рамантызму»...

Аб якіх такіх «калючках» ідзе гутарка, ня трудна здагадацца. Гэта, паводле Клейнборта, нашае сацыялістычнае будаўніцтва, гэта суровыя будні нашай клясавай барацьбы, гэта нашае разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсіх участках будаўніцтва, гэта—пралетарская дыктатура. І Дудар, гэты сьпявак кулацкай контр-рэвалюцыі, усхваляецца і ідэалізуецца Клейнбортам на старонках савецкага альманаху.

Нацыянал-дэмакраты, як адначалася ўжо гэта ў артыкуле **т. Васілевіча**, шукаюць уселякія «лазейкі», абыходныя шляхі для сваіх выступленьняў, для правалаканьня сваіх погладаў. Адней з яўных праяў нацыянал-дэмакратызму і зьяўляецца клейнбортаўская прадмова, сутнасьць якое павінна быць яснай для савецкага чытача.

III.

Мы вышэй гаварылі, што ў клейнбортаўскіх поглядах мы бачым сплянценьне рускага шавінізму з усёй выразнай сыстэмай нацыянал-дэмакратычных тэорый, «кветкі» якіх мы прыводзілі ў нашым артыкуле. І важна паказаць, як гэты-ж Клейнборт, прапаведуючы рад махровых тэорый беларускага нацыянал-дэмакратызму, выступае як махровы рускі шавініст. У прадмове да ленінградзкага выданьня «Альманаха бел. літаратуры», гаворачы аб паслякастрычніцкай літаратуры на Беларусі і ў прыватнасьці аб «Маладняку», прафэсар піша:

«Праўда, з адыходам найбольш таленавітых «Маладняк», як гаворыцца, абмялеў. Гэта асабліва адбілася на часопісі «Маладняк», на яго «пристрастии» да таннага «марксызму», на яго зацёртых словах аб менскім індустрыялізьме, за якімі стаіць схэма і пры гэтым схэма чыста местачковага тону».

«Менскі індустрыялізм», «танны марксызм», «чыста местачковы тон», як усё гэта тыпова для злобствуючага рускага шавіністага, калёнізатара, які ніяк ня можа згадзіцца з фактам бурнага сацыялістычнага росту нацыянальных рэспублік, раней прыгнечаных царызмам абласьцей!

«Менскі індустрыялізм»—[illegible] многа сказана ў гэтых двух словах! У іх заключаецца ўвесь панска-нагардлівы тон расійскага пэнмана, чыноўніка, расійскага прафэсара-шавіністага ў адносінах да сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі. Для яго наш гіганцкі рост, рост і стварэньне прамысловасьці, шпаркія тэмпы гаспадарчага і культурнага разьвіцьця, якія зьнішчаць фактычную няроўнасьць — для яго ўсё гэта ўкладваецца ў нічога ня значным «менскім індустрыялізьме», бо ён рускі шавіністы хацеў-бы вярнуць старыя добрыя часы—часы калёнізатарскай палітыкі ў адносінах да нацыянальных маншасьцяй. І таму ў бясьсільнай злосьцю перад размаахм нашага будаўніцтва ён крычыць аб «танным марксызьме», аб «местачковых тонах» нашага будаўніцтва, вянчаючы гэтымі «тэарытычнымі» разважаньнямі спробы вялікадзяржаўнага шавінізму ўставіць палкі ў калёсы гаспадарчага, сацыялістычнага разьвіцьця БССР.

І зразумела, чаму гэты-ж Клейнборт выступае супроць «Маладняка», заўважаючы, што тут у нас у БССР.

«для пралетарскага мастацтва яшчэ няма адпаведнай матар'яльнай глебы»...

Клейнборт такім чынам выступае супроць магчымасьці разьвіцьця ў БССР пралетарскай літаратуры, бо тут няма, паводле яго думкі, «матар'яльнай глебы» для гэтага, тут няма пэрспэктыў для разьвіцьця прамысловасьці, а значыцца, і для разьвіцьця рабочай клясы. Усе гэтыя погляды зьвязаны адзін з другім, выцякаюць адзін з другога. Усім гэтым поглядам трэба абвясьціць самую рашучую і бязьлітасную барацьбу.

Клейнбортаўшчына—гэта палітычныя спробы ворага на ідэалёгічным фронце выступіць супроць нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Клейнбортаўшчыне мы павінны даць рашучы адпор.

А. А.

Паведамленьні

13-га чэрвеня, а 6-й г. вечары, памяшканьні ЦП саюзу друкароў Працы, 3-ці паверх) адбудзецца ПЛЕНУМ ДЖЭНЬНЕ БЕЛБЮРО СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ.

На парадку дня: аб КАДРАХ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ (дакл. камітэту па справах друку); СПРАВАЗДАЧА МСЦКОМУ ГАЗ. «БЕЛ. ВЁСКА»; аб гарскім праве (дакл. БДВ); аб парадку дня ЧАРГОВАГА ЗЬЕЗДУ СЭКЦЫІ і другія справы. Запрашаюцца прадстаўнікі камітэту па справах друку, ЦДВ, Цэнтравыдавецтва, Наркамасьветы, Акадэміі Навук, члены сэкцыі працаўнікоў друку і пісьменьнікі.

Бюро сэкцыі ЦДП.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У пак. № 19 г[illegible] павая кансультацыя. — Задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд — [illegible] дакладчыкаў Фрына. і Кастрычніцкі. Пачатак а 6-й гадз. веч.

ЖАКТ № 11. У памяшк. стар. [illegible] ЖАКТу № 11 (Камсамольская, 40) [illegible] будзецца нарада жыхароў - камсамольцаў тых ЖАКТу № 11. Пач. а 7 гадз.

Дом Асьветы. А 8 гадз. веч. адбудзе[illegible] ца па-за чарговы адкрыты сход п[illegible] асьветы. і дашкольнай парт'ячэйкі [illegible] ступным парадкам дня: прапра[illegible] тэзісаў да XVI партзьезду.

Дом Асьветы. А 7-й гадз. веч. а[illegible] ны сход тэхпрацаўнікоў членаў с[illegible] працасьветы. У парадку дня: да[illegible] тав. Рычкова на тэму: «БССР на[illegible] дадні 10-й гадавіны вызваленьня [illegible] русі ад белапалякаў».

Фрунз. РК КП(б)Б. У памяшк. [illegible] КП(б)Б (заля пасяджэньняў, 3-ці [illegible] верх) адбудзецца раённая нарада к[illegible] нікоў сэктароў партвучобы па пы[illegible] ні аб ходзе падрыхтоўчай работы [illegible] арганізацыі гурткоў, на прапрацо[illegible] зьездаў і аб сетцы партвучобы [illegible] 1930-31 год. На нараду павінны зь[illegible] ца ўсе вылучаныя кіраўнікі гурт[illegible] Пач. а 6-й гадз. веч.

БДУ. У аўдыторыі № 8 (прыр[illegible] знаўчы корпус, 2-гі паверх) адбудзе[illegible] пасядж. асьпірантуры - гістарычнага [illegible] міпару. Спрэчкі па дакладу тав. **Ра[illegible] віча** «Аграрныя спрэчкі ў 3-й Д[illegible] жаўнай Думе». Запраш. навуковых [illegible] цаўнікі — гісторыкі і асьпіранты Б[illegible] Камвузу. Пач. а 7 гадз. веч.

Групком № 10. У групкоме [illegible] школа, Гарадзкая, 2) адбудзецца [illegible] грамадаведаў вяч. школ (у тым ліку чы[illegible] гуначнікаў) узвыш. тыпу і перш. ступ[illegible] на пытаньні аб распрацоўцы праграм п[illegible] грамадазнаўстве для вяч. школ.

Наступны сход адбудзецца заўтра [illegible] 12 чэрв., а 12 гадз. раніцы.

ЗАЎТРА

ЖАКТ № 17. У канцыляр. ЖАКТ[illegible] № 17 (Гандлёвая, 50) паўторна склікае[illegible] ца сход камуністых, якія пражываюц[illegible] у дамох ЖАКТу. Пач. а 7-й гадз. ве[illegible]

Інстытут Гісторыі Партыі і Рэврух Беларусі. У габінэце ленінізму (Ка[illegible] вуа) на таварыстве гісторыкаў - марксыстых адбудзецца даклад тав. **Гесэн** аб кнізе праф. **Нікольскага** «Истори русской церкви». Запрашаюцца ўсе н[illegible] вуковых работнікі - выкладчыкі, асьпі[illegible] ранты і вылучэнцы на гістарычных ды[illegible] цыплінах. Пач. а 8-й гадзь веч.

АД КУЛЬТПРОПУ МЕНАКРУГКОМУ КП(б)Б

15-га чэрвеня, а 10 гадз. ран., адбуд[illegible] акруговая нарада культпропу з наступным парадкам дня:

1. Задачы прапаганды марксызму-ленінізму ў сувязі з чарговымі задачамі партыі (дакл. т. Каменштэйн);
2. Вынікі партасьветы ў акрузе [illegible] 1929-30 навуч. год (дакл. Гарэлік).
3. Аб сыстэме масавай партасьвет[illegible] ў горадзе і вёсцы на 1929-30 навуч. г[illegible] (дакл. Орліс). Судаклад АК ЛКСМБ.
4. Аб сыстэме тэарытычнай вучобы [illegible] актыву на 1930-31 год (дакл. т. Модэл[illegible]

На нараду ваўлікаюцца загадчы[illegible] АПА і Культпропаў РК, раённых п[illegible] пагандыстых, заг. АПА РК ЛКСМБ [illegible] гораду і раёну, заг. сэктароў партвуч[illegible] бы лчэек менскай гарадзкой арганіз[illegible] цыі.

Канфэрэнцыя працягнецца тры д[illegible] 15-17 чэрвеня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Тэатр саду „Прафінтэрн"
Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
Сёньня, 11 чэрвеня, адкрыты спэктакль „На всякого мудреца довольно простоты"
Заўтра, 12 чэрвеня адкрыты спэктакль „МИГА"
Білеты ў раб. касе. Астача білетаў у касе саду
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 11 чэрвеня „ЖИДОВКА" муз. ГАЛЕВІ
Заўтра 12 чэрвеня „ДЕМОН" муз. Рубінштэйна
Білеты ў касе тэатру і раб. касе Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

КІНО Інтэрнацыянал
2-гі ТЫДЗЕНЬ ВЕЧЕР у ТВАР — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: — кіно-хроніка Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая № 6 | Прысьвечаная XIII зьезду КП(б)Б
Мастацкая кіно-аповесьць
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г.
Новы замежны мастацкі фільм РВАНЫЯ ВЕТРАЗІ — у 8 частках — ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 ГАДЗ. Каса адкрыта з 6 гадз.

КІНО САД (Савецкая, 71)
АПОШНЯЯ 3-я СЭРЫЯ МІС МЭНД — у 10 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта з 5 гадз.

КІНО Пралетары
2-ГІ ТЫДЗЕНЬ „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА" 2 сэрыі 12 частак у адзін сэанс. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. Каса адкрыта з 12 гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Нямецкі мастацкі баявік ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ ў 7 част. У галоўнай ролі КСЕНІЯ ДЭСЬНІ. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз., 2-га—9 гадз., Каса—з 5 гадз. 30 м.

КІНО СпартаК

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗЭМЕДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях: па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дэжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дэжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыаваную плату.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
На завочны пэдфак пры пэдфаку БДУ на 1930-1931 навучальны год.
Завочны Пэдфак, які існуе другі год, мае наступныя аддзяленьні: 1) сацыяльна-гістарычнае, 2) палітыка-асьветнае, 3) літаратурна-лінгвістычнае і 4) пэдолёга-пэдагагічнае. Тэрмін навучаньня па ўсіх аддзяленьнях 3-гадовы.
На сацыяльна-гістарычным і літаратурна-лінгвістычным аддзяленьнях адчыняецца яўсэкцыя.
У гэтым навучальным годзе будзе прынята на I курс сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня 150 асоб, палітыка-асьветнага —150, літаратурна-лінгвістычнага—150 і пэдолёга-пэдагагічнага—50.
Прымаюцца на завочны пэдфак настаўнікі, рабочыя ад варштату, батракі, калгасьнікі, сяляне-беднякі і сераднякі, маючыя сярэднюю асьвету.
Навучаньне дармовае. Прыём адбываецца бяз іспытаў.
Асобы, якія жадаюць паступіць на завочны пэдфак, паўнаюць аб гэтым заяву на імя прыймовай камісіі завочнага пэдфаку і прыкладаюць да яе наступныя дакументы:
1) Анкету завочнага пэдфаку, пасьведчаную адпаведнай савецкай установай або прафсаюзнай арганізацыяй.
2) Дакумант аб асьвеце.
3) Дакумант аб месцы працы.
Заявы прымаюцца з 15 чэрвеня па 15 жніўня.
Анкета завочнага пэдфаку будзе абвешчана ў даведніку для паступаючых на завочны рабфак і пэдфак.
АДРАС: Менск, Замляробчы завул., д. № 4.
БЮРО ЗАВОЧНАГА ПЭДФАКУ.

Да ведама чл. ЖАКТУ № 1
У ЧАЦЬВЕР, 12 чэрвеня а 7 гадз. увечары ў клюбе харчавікоў імя Сталіна адбудзецца — членаў ЖАКТ'у № 1 — Яўка абавязкова —
АГУЛЬНЫ СХОД

ЭЛЬВОД ПАВЕДАМЛЯЕ АБАНЭНТАЎ, што, згодна загаду ВСНГБ, абвешчанага ў газ. „Савецкая Беларусь" ад 22 сакавіка г. г.
— ЭЛЬВОДАМ —
ЗЬНІМАЮЦЦА ў абанэнтаў ШЧОТЧЫКІ
для праверкі ў палаце мер і вагі.
На зьняцьце шчотчыкаў мацёры маюць адпаведныя пасьведчаньні Абанэнтам, якія будуць перашкаджаць зьняцьцю шчотчыкаў, БУДЗЕ СПЫНЕНА ПАДАЧА ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, ножу и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.
МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

9|VI на Бабруйскай вул. ЗГУБЛЕН ЦЫНКАВЫ КАНАТ (трос). Прашу зьвярнуць ЗА ЎЗНАГАРОДУ у Белкалгасбуд, Савецкая, 70.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газету „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газеты „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тэл. 2-49

БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ (г. Менск, Замляробскі завул. д. № 12)
ЗАПРАШАЕ
на сталую, настаўніцкую работу прафэсароў, дацэнтаў, інжынэраў і асыстэнтаў па:
1. Вышэйшай матэматыцы,
2. Тэарытычнай механіцы,
3. Прыкладной механіцы,
4. Супраціўленьні матар'ялаў,
5. Начартальнай геамэтрыі і праектаваньня чарчэньні,
6. Машынабудаўнічым чарчэньні,
7. Фізыцы,
8. Хэміі (незарганічнай і арганічнай),
9. Геадэзіі,
10. Будаўнічым мастацтве,
11. Тэхналёгіі будаўнічых матар'ялаў,
12. Ацепленьні і вэнтыляцыі,
13. Водазабесьпячэньні і каналізацыі,
14. Электратэхніцы,
15. Цеплатэхніцы,
16. Металюргіі,
17. Палітэканоміі,
18. Дыялэктычным матэрыялізьме,
а таксама інжынэраў па кіраўніцтве вытворчым навучаньням (практыкай) студэнтаў па розных спэцыяльнасьцях.
Да заяў неабходна прыкласьці падрабязны жыцьцяпіс, сьпіс прац (калі ёсьць) і пажадана рэкамендацыя навуковых і грамадзкіх установаў і арганізацый.
НАГРУЗКА І ЎМОВЫ ПА ЗГОДЗЕ.
Беларускі Палітэхнічны Інстытут.

ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ НАВІНКІ
1. Кляшторны.—ВЕТРАЗІ—зборніе вершаў. Стар. 129. Цана 90 кап.
2. Шышкоў В.—ГАЛАВАСЕК—апавяданьні. Стар. 47. Цана 16 кап.
3. А. Фадзееў.—СУПРОЦЬ ПЛЫНІ—апавяданьне. Стар. 56. Цана 15 кап.
4. Н. Лашко.—З ЧАРАДОЮ—апавяданьні. Стар. 237. Цана 1 руб.
5. Н. Нікіфараў.—СУПРОЦЬ СТАРОГА БЫТУ.—в блёк-ноте партработніка. Стар. 64. Цана 20 кап.
Бібліятэка школьніка.
С. Баранавых.—ЗЛОСЬЦЬ—апавяданьні. Стар. 60. Цана 38 кап.
Бібліятэка чырвонаармейца.
Б. Квасьніцкі.—МАНЭЎРАНАЕ ШРАПНЭЛЬ—гэтнарыстычныя апавяданьні з жыцьця чырвонай арміі. Стар. 44. Цана 10 кап.
Вакол сьвету.
Н. Карынцаў.—У ПЯСКОХ ПУСТЫНІ. Стар. 60. Цана 22 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Вайск. кн. Булыгіна А. І. 503
Паявая кн. № 20709 Фоміна С., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам 504
Вайск. кн. Буха А., выд. Нараўлянск. РВК 505
Паявая кн. Садоўскага Л. А., выд. Нараўлянск. спаж. т-вам 506
Чырвонаарм. кн. Невядомскага С., выд. Крупск. РВК 507
Каап. кн. № 2703 Слайкоўскага М. П., выд. Барысаўск. прыгар. спаж. т-вам 508
Вуч.-конск. кн. №472 Рэдзько Ц. Мэтр. пасьведч. Хвойняк А. І., выд. Гастомінск. с.-с. 509
Вуч.-конск. кн. Храпунова А. В. 510
Вуч. карт. Кохана П. С., выд. Лепельск. РВК 512
Камсам. біл. № 124412 Піскуна Я. Х., выд. Полацк. АК ЛКСМБ 513
Каап. кн. Карпелевіча А. 514
Лек. кн. Шувайскага Э. М., выд